Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+ТВ ПРАГРАМА

4 ЖНІЎНЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 149 (30029)

ЧАГО ЧАКАЮЦЬ АД ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ 3

ДА ДНЯ ПІСЬМЕНСТВА – КНІГІ АД ПІСЬМЕННІКАЎ 4

КАРАТКА

- Аранжавы ўзровень небяспекі з-за спякоты аб'яўлены ў Беларусі 4—6 жніўня.
- **У Беларусі намалацілі больш за 2 млн тон збожжа каласавых культур.**
- Адзіны праязны для гарадскога наземнага транспарту можа з'явіцца ў Мінску да верасня.
- **Пункт здароўя Чырвонага Крыжа адкрылі ў Веткаўскім раёне.**
- Адна з чэргаў будаўніцтва аб'екта па пераводзе Мінска на артэзіянскія крыніцы завершана на 95 працэнтаў.
- **МНС Беларусі запускае новую інфармацыйную кампанію «Будзь побач з дзіцем!».**
- У Беларусі за паўгода да адказнасці за самагонаварэнне прыцягнута больш за 1 тысячу чалавек.
- **Новы хірургічны модуль у Гомельскім абласным анкадыспансеры пабудуюць да канца 2024 года.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Леанід МАРТЫНЮК, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці:

«Наведваючы прадпрыемствы розных формаў уласнасці, у чарговы раз пераконваешся, што яны маюць вялікае значэнне для нашай краіны і развіцця яе эканомікі. Бо гэта не толькі працоўныя месцы і заработная плата людзей, але і адначасова брэндзіраванне Беларусі на постсавецкай прасторы: калі фірма працуе і прадае беларускі брэнд, то рэкламуе і саму краіну. Прыватныя прадпрыемствы, якім у свой час была аказана дзяржпадтрымка, актыўна развіваюцца і паказваюць вынікі».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ПРАЛІЧЫЦЬ УСЁ РАЗУМНА І ВЫЗНАЧЫЦЬ, ШТО БОЛЬШ ВАЖНА»

Клопат пра цялят, абед з камбайнерамі і кадравыя пытанні — падрабязнасці паездкі Прэзідэнта ў Гродзенскую вобласць

Рабочы тыдзень кіраўніка дзяржавы ў рэгіёнах працягваецца. У чацвер Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведаў Бераставіцкі раён Гродзенскай вобласці, дзе азнаёміўся з дзейнасцю РСУП «Алекшыцы», адной з найлепшых у краіне гаспадарак па вырошчванні буйной рагатай жывёлы. Як адзначаў Прэзідэнт у размове з калектывам ААТ «Белавежскі», наведваючы розныя гаспадаркі, ён па крупінках збірае перспектыўныя напрамкі для развіцця вёскі. Таксама камандзіроўкі ў рэгіёны — выдатная магчымасць праверыць ход уборачнай кампаніі, якая сёлета атрымліваецца сапраўднай бітвай за ўраджай.

Фота БелТА.

ПЛЮС ШЭСЦЬ ПРАЦЭНТАЎ КОЖНЫ ДЗЕНЬ

Таму і першае пытанне — пра ход жніва. Як далажыў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір Гракун, на ранак чацвярга ў краіне ўжо ўбрана трэць плошчаў збожжавых і зернебабовых культур. У розных абласцях уборка праходзіць па-рознаму. Напрыклад, Брэсцкі рэгіён ужо блізіцца да паловы, а на Віцебшчыне ледзь перасягнулі паказчык 15 працэнтаў. Усяго па краіне намалочана 2,1 мільёна тон збожжа. Пры гэтым тэмпы ўборачнай вышэйшыя за мінулагоднія, але ўраджайнасць ніжэйшая. Безумоўны лідар — Гродзенская вобласць: ураджайнасць у рэгіёне 49,3 цэнтнера з гектара. Для параўнання: у Гомельскай вобласці ўсяго 20,3 цэнтнера з гектара.

Гаворачы пра плошчы ўборкі пасеваў збожжавых, Прэзідэнт даў Міністэрству сельскай гаспадаркі і харчавання задачу — выходзіць на шэсць працэнтаў у дзень. Тады, па яго словах, будзе «больш-менш».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што надвор'е сёлета непрадказальнае — «то засушыць, то залье». Таму задзейнічаць трэба кожную свабодную хвіліну.

СТАР. 2

ФАРМАТ СПАБОРНІЦТВАЎ — АДКРЫТЫ

II ИГРЫ СТРАН СНГ БЕЛАРУСЬ 2023

Чым унікальныя II Гульні краін СНД

Сёння распачынаюцца першыя спаборніцтвы II Гульняў краін СНД. У чым унікальнасць гэтага спартыўнага форуму? Колькі краін возьме ўдзел у Гульнях і як настроены нашы спартсмены? Аб гэтым з першых вуснаў даведаліся ад намеснікаў міністра спорту і турызму.

На II Гульні краін СНД зарэгістравалася больш за 2,2 тысячы спартсменаў, расказаў журналістам **першы намеснік міністра спорту і турызму Аляксандр ДАРАХОВІЧ.**

— Фармат гэтых спаборніцтваў адкрыты. Нагадаю, што ў I Гульнях краін СНД прымалі ўдзел дзевяць краін і 1138 спартсменаў. Сёння на II Гульні краін СНД, якія праводзяцца па 20 відах спорту, зарэгістраваліся 2214 спартсменаў з 22 краін, — сказаў Аляксандр Дараховіч.

СТАР. 4

Фота БелТА.

Жніво-2023

КАРАВАЙ ПЕРШАГА РЭГІЁНА

Яго важкасць і якасць забяспечваюцца ўмелымі рукамі хлебаробаў

Брэстчына ўпэўнена ўзыходзіць на экватар уборачнай кампаніі. І хоць надвор'е, як найчасцей бывае, крыху падводзіць у самы гарачы час, але хлебаробы плённа выкарыстоўваюць кожную пагодную гадзіну. У тым меў магчымасць упэўніцца кіраўнік дзяржавы, які пабываў на гэтым тыдні на збожжавых палетках ААТ «Белавежскі» Камянецкага раёна.

Кіроўца ААТ «Белавежскае» Сцяпан ЦАРУК.

Вядомая ў нашай краіне гаспадарка — сучаснае, паспяховае вялікае прадпрыемства з працоўным калектывам больш за дзве тысячы чалавек. У склад акцыянернага таварыства ўваходзіць амаль дзясятак вытворчых падраздзяленняў, у тым ліку мясакамбінат, свінагадоўчы комплекс, завод па вытворчасці камбікармоў. Як адзначылі спецыялісты, надвор'е сёлета было адносна спрыяльным для раслінаводчай галіны сельгаспрадпрыемства. Таму ў «Белавежскім» чакаюць рэкордная ураджайнасці. Апошняя, як вядома, забяспечваецца бездакорнай тэхналогіяй і рукамі такіх старанных працаўнікоў, як, напрыклад, **Сцяпан ЦАРУК, кіроўца з аддзялення «Расна»** сельгаспрадпрыемства. На сваім МАЗе Сцяпан першы ў вобласці перавёз 2000 тон збожжа ўраджаю-2023.

СТАР. 3

«ПРАЛІЧЫЦЬ УСЁ РАЗУМНА І ВЫЗНАЧЫЦЬ, ШТО БОЛЬШ ВАЖНА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ён таксама нагадаў пра сваё даручэнне зрабіць акцэнт на культурах ранняга паспявання, што асабліва актуальна для паўночных раёнаў. Практыка паказала, што гэта правільны падыход. «Добра, што былі азімыя ячмень, рапс. Удалося ўбраць пятую частку на пачатак жніўня», — адзначыў Прэзідэнт. Пастаўлена задача — сёлета па такіх культурах павінен быць зрух.

Асабліва кіраўнік дзяржавы пацікавіўся ўраджайнасцю льну.

«Лён трэба заканчваць церабіць. Кроў з носа трэба выконваць план», — даў даручэнне Аляксандр Лукашэнка. Адказныя чыноўнікі запэўнілі Прэзідэнта, што льнозаводы і льнокамбінат будуць поўнасцю загружаныя сыравінай. Аднак па доўгім валакне ў Віцебскай вобласці заданне не будзе выканана. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што гэта вельмі дрэнны факт, бо Віцебшчына — рэгіён, які актыўна сее лён. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў правесці эксперымент — пасеяць лён на эксперыментальным полі Прэзідэнта. Зрабіць усё па тэхналогіі і ацаніць вынік.

Па традыцыі, наведваючы сельскія гаспадаркі ў рэгіёнах, Прэзідэнт цікавіцца не дасягненнямі, а праблемамі на месцах. «Што насцярожвае ва ўсім комплексе ўборачнай? У дадзеным выпадку па Гродзенскай вобласці», — спытаў ён. Але глабальных праблем ні ў Гродзенскай вобласці, ні ў Бераставіцкім раёне, ні ў «Алекшыцах» няма. Усе пытанні вырашаюцца ў рабочым парадку. Віцэ-прэм'ер Леанід Заяц далажыў, што і па краіне ўсе пытанні і з палівам, і з камбайнамі вырашаныя. Адзінае, што сёлета трэба адначасова нарыхтоўваць кармы, збіраць збожжа і весці яшчэ шмат рознай работы. Гэта патрабуе і кадраў, і тэхнікі, і часу. Але ўсе пытанні вырашальныя.

ДА ЦЯЛЯЦІ — ЯК ДА ДЗІЦЯЦІ

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з дзейнасцю комплексу па адкорме і ўтрыманні буйной рагатай жывёлы. Комплекс у «Алекшыцах» — адзіны ў раёне, дзе ўтрымліваецца пяць тысяч галоў. Прэзідэнт звярнуў увагу на самую балючую тэму айчыннай жывёлагадоўлі — падзеж жывёлы, узровень якога ў краіне застаецца высокім. Па словах Прэзідэнта, адзін з магчымых варыянтаў вырашэння праблемы — «імем рэвалюцыі» забіраць цялят з «нехлямяжых» гаспадарак у тыя, дзе ўмеюць гадаваць маладое пагалоўе, дзе для гэтага створаны ўмовы і ёсць адпаведныя тэхналогіі. Ён падкрэсліў, што праблему неабходна аператыўна вырашыць. Прэзідэнт папярэдзіў, што больш на такую тэму не будзе размаўляць ні з міністэрствам сельскай гаспадаркі, ні з губернатарамі.

«Наогул не павінна быць падзяжу. Ва выключэннем нейкіх выпадкаў. Таму ў тых, хто не ўмее трымаць цялят пасля нараджэння да месяца, жывёлу трэба забіраць. Не трэба сялян крыўдзіць, трэба заплаціць. І гэтак будзе лепш, пакуль у іх не адпрацуюць тэхналогію. Стаўленне да нованароджанага цяляці павінна быць, як да дзіцяці», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Ён паставіў задачу вызначыць у раёне, якім гаспадаркам трэба дапамагчы з утрыманнем жывёлы, і вызначыць гаспадаркі, што могуць забраць да сябе цялят. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, гэта павінна быць наладжана ў абласцях. І так трэба рабіць жалезабетонна.

Прэзідэнт нагадаў, што цяпер у краіне ідзе работа над пераводам жывёлы ў малочнатварныя комплексы. За пяцігодку ў сучасныя тэхналагічныя комплексы будзе пераведзены ўвесь дойны статак. Аляксандр Лукашэнка таксама заўважыў, што неабходна стварацьпрымальныя ўмовы для адкорму і ўтрымання жывёлы. «Нам трэба не тое каб падабрацца да нейкага адзінага тэхналагічнага працэсу, але вызначыцца», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, вялікае значэнне маюць кадры, людзі з характарам, гатовыя выконваць пастаўленыя задачы.

Прэзідэнт таксама звярнуў увагу, што старыя фермы трэба рэканструяваць і рабіць з іх сучасныя малочнатварныя комплексы. Такая работа цяпер праводзіцца ў «Алекшыцах». Тут на базе старой фермы пабудавалі новыя кароўнікі і будынак малочна-даільнага блока з сучасным абсталяваннем, пераважна айчыннай вытворчасці. Будаўніцтва гэтых аб'ектаў пачалі ў мінулым жніўні, сёння амаль усё гатова для прыёму жыхароў. Па праекце кошт будаўніцтва склаў 13,7 мільёна беларускіх рублёў. Аднак фактычна чакаецца, што ён знізіцца да 12,3 мільёна беларускіх рублёў. Прэзідэнт нагадаў пра сваё даручэнне вызначыць аптымальны варыянт як па функцыянале, так і па кошце. Без непатрэбнай эканоміі, але і не трацячы лішнія сродкі, якіх няма. Што да комплексу ў «Алекшыцах», кіраўнік дзяржавы даў даручэнне Камітэту дзяржаўнага кантролю ўважліва пралічыць кошт будаўніцтва аднатыпнага даільнага цэха без дадатковых прыбудоў і гэтак далей. «Усё трэба раскласці, — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы. — А то мы палацы будуем, а не ведаем, колькі тое каштуе». Гэта важна, бо ў розных рэгіёнах кошт адрозніваецца. А стаіць задача — знайсці аптымальны варыянт, аб чым неаднаразова вялася гаворка. «Нам трэба вызначыцца з коштам, каб мы сялян не абдзіралі», — сказаў Прэзідэнт.

Губернатар Гродзенскай вобласці Уладзімір Каранік далажыў пра развіццё малочнай галіны ў рэгіёне. Па яго словах, за год значна павялічылася пагалоўе жывёл, расце надой на адну карову. Сёлета ў рэгіёне плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 15 малочнатварных комплексаў.

ДА ТЭХНІКІ ТРЭБА СТАВІЦЦА ПА-ГАСПАДАРСКУ

Прэзідэнт азнаёміўся, як у гаспадарцы праходзіць уборачная кампанія. У прыватнасці, як збіраюць пшаніцу. Прыезд кіраўніка дзяржавы на поле якраз супаў з часам абеду камбайнераў, для якіх разгарнулі спецыяльную палявую кухню. Аграрыі запрасілі Прэзідэнта да стала. А ён не адмовіўся. Цяпер гэтыя людзі праводзяць у полі часу больш, чым дома. Таму ежа, як хатняя, — гарохавы суп, катлета з бульбяным пюрэ, гародніна, хлеб і чай з булачкай. Суп Прэзідэнт пакаштаваў сам. «Ну нічога. Я таксама так гатую», — ацаніў ён. За абедам — размовы аб рабоце. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся ў камбайнераў, які стан збожжа, як ідзе ўборка ў цяперашніх умовах надвор'я.

Прэзідэнт таксама агледзеў камбайны, якія працуюць у полі, пацікавіўся асаблівасцямі работы на машынах «Гомсельмаша». У Гродзенскай вобласці адна з самых вялікіх нагрузак на адзін камбайн — больш за 300 гектараў. Усяго сёлета ў рэгіёне плануецца ўвесці ў строй 147 новых камбайнаў розных мадыфікацый. На палях, што адносяцца да «Алекшыц», працуе новая мадэль GS2124, якая паступіла ў гаспадарку летась. Стваралася такая мадэль па даручэнні Прэзідэнта на замену імпартным аналагам. Мясцовыя камбайнеры станоўча ацэньваюць гэтую тэхніку, матор ні ў чым не ўступае замежным, усё рэгулюецца. «Значыць, гэты камбайн добры?» — спытаў кіраўнік дзяржавы. Камбайнер адказаў станоўча. «Аказваецца, мы ўсё можам», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Галоўны пасыл Прэзідэнта — да тэхнікі ставіцца па-гаспадарску. Старую тэхніку не складваць пад плотам, не выкідваць. А рамантаваць і аддаваць у гаспадаркі, дзе ў ёй ёсць патрэба.

«ТРЭБА ВАРУШЫЦЬ ВУЧОНЫХ»

Падчас агляду сельскагаспадарчых угоддзяў кіраўнік дзяржавы вярнуўся да тэмы, якую ўжо закранаў падчас наведвання ААТ «Белавежскі», — да насення айчыннай вытворчасці. Па словах Прэзідэнта, айчыннае насенне — гэта не толькі імпартазамяшчэнне, але і пытанне харчовай бяспекі. Адпаведныя задачы ўжо пастаўлены перад вучонымі. Плануецца, што маштабна і ўсебакова пытанне вытворчасці насення айчынных культур будзе абмеркавана на нарадзе, прысвечанай насеннаму матэрыялу па ўсіх культурах.

«Трэба працаваць з вучонымі. Трэба іх варушыць. Скончыцца ўборка — трэба вярнуцца да гэтага пытання. На маім узроўні збяромся і паглядзім, падумаем. Трэба страсянуць вучоных. І няхай рыхтуюцца. І не проста расказваць, якія героі, а што дрэнна», — паставіў задачу Прэзідэнт. Ён заўважыў, што калі б усё было добра з беларускім насеннем, то гаспадаркі не куплялі б імпартнае, даражэйшае.

«Акрамя азімага рапсу і азімага ячменю, нам яшчэ трэба паглядзець, што яшчэ пасеяць, асабліва на поўначы. Пакуль мы не зменім севазвароты на поўначы і не знойдзем новыя культуры, яны будуць целяпацца. Вядома, плюс дыспыліна і парадак», — падкрэсліў Прэзідэнт.

У «Алекшыцах» на сілас і зялёны корм ідуць культуры, вырашчаныя з айчыннага насення, збожжа атрымліваюць з імпартнага. Прэзідэнт пацікавіўся, чым беларускія культуры недацягваюць да замежных. Галоўны фактар — прадукцыйнасць, нашы сарты слабейшыя. Але, як адзначыў Леанід Заяц, там, дзе ёсць тэхналогіі, і айчынныя культуры нядрэнна сябе паказваюць. Ураджайнасць залежыць і ад якасці глебы, і ад угнаенняў.

«ПЕРШЫ НАМЕСНІК ГУБЕРНАТАРА БОЛЬШ МАЕ РЫЧАГОЎ УПЛЫВУ, ЧЫМ МІНІСТР СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ»

Падчас камандзіроўкі на Гродзеншчыну было абмеркавана кадравае пытанне, якое сёння цікавіць многіх, — хто зойме пасаду міністра сельскай гаспадаркі і харчавання. Былога міністра Ігара Брыло Прэзідэнт нядаўна падчас селектарнай нарады прызначыў сваім памочнікам па Віцебскай вобласці і даручыў аператыўна падабраць кандыдатуру новага міністра. На дадзеную пасаду рэкамендаваўся і першы намеснік Гродзенскага аблвыканкама Юрый Валяваты. Але, як аказалася, у Гродзенскім рэгіёне ён можа быць больш карысным, чым у міністэрстве. Чаму, растлумачыў памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Юрый Караеў. «У міністэрстве сельскай гаспадаркі галоўнае — гэта камандуючы фронтам, а не начальнік генштаба. Таму што ўсё вырашаецца на месцах. Таму першы намеснік губернатара, не ў крыўду, больш мае рычагоў уплыву, чым міністр сельскай гаспадаркі», — пераводзячы на вайсковую мову, растлумачыў ён.

Прэзідэнт такі пункт гледжання ў цэлым падтрымаў. «Усё-ткі міністэрства сельскай гаспадаркі павінна займацца сваёй справай. Яно павінна займацца новымі прарыўнымі напрамкамі, тэхналогіямі», — адзначыў ён. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў падпарадкаванні міністэрства павінна быць агульная стратэгія, а ўсё астатняе павінна вырашацца на месцах.

Напрыклад, у Гродзенскай і Брэсцкай абласцях лічаць, што работы па вапнаванні глеб больш важныя, чым правядзенне меліярацыі. Але ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання мяркуюць наадварот, бо даручэнні Прэзідэнта па меліярацыі трэба выконваць. Аляксандр Лукашэнка параіў спецыялістам сабрацца і разгледзець, што ў канкрэтным рэгіёне дасць большы эфект.

Асобна кіраўнік дзяржавы звярнуўся да віцэ-прэм'ера Леаніда Зайца. «Ты хвалюешся за аб'ёмы, а губернатар хвалюецца за вобласць. І павінна быць справядліва. Вы выпучыце з гэтай сумы львіную долю, дапусцім, на Гомель і на Віцебск. А што Гродна ад таго? Дык ён гаворыць: я вазьму частку нейкую ад меліярацыі і правапную глебы. Калі гэта так крытычна, са спецыялістамі паглядзіце — нельга дапусціць, што асушваем, уводзім новыя плошчы, а цяперашнія загінуць, не дадуць ураджай. Увогуле, разбярыцеся. Калі тут мясцовыя маюць рацыю і сёння катастрафічна важна для Брэста і Гродна вапнаваць, значыць трэба вапнаваць», — сказаў Прэзідэнт. Пры гэтым, звярнуў ён увагу функцыянераў, не трэба забываць, што лішніх грошай няма. Таму Прэзідэнт раіць пралічыць усё разумна і вызначыць тое, што больш важна.

Валерыя СЦЯЦКО,
Бераставіцкі раён.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прэзідэнт Бразіліі падтрымаў ідэю пашырэння БРІКС

Бразілія падтрымлівае ідэю пашырэння БРІКС, а таксама прасоўванне праз дадзенае аб'яднанне міжнароднага гандлю з больш справядлівымі механізмамі, заявіў кіраўнік паўднёвай краіны. Аб гэтым паведаміла іспанскае інфармацыйнае агенцтва EFE. «Прэзідэнт пацвердзіў, што падтрымлівае ўключэнне ў БРІКС новых партнёраў. Ён падкрэсліў, што згаданая пляцоўка павінна прасоўваць новыя спосабы вядзення гандлю», — цытуе EFE Лула да Сілву. Той у чарговы раз выказаўся за перагаворы аб выкарыстанні ў гандлі альтэрнатыўных долару ЗША валют: «Усім вядома, што я выступаю за стварэнне ўласнай валюты для гандлю паміж нашымі краінамі». Прэзідэнт Бразіліі таксама заявіў, што Новы банк развіцця, створаны БРІКС, павінен быць «больш шчодрай» альтэрнатывай МВФ і дапамагаць краінам, якія сталі на шлях развіцця. Лула да Сілва выказаў думку, што аб'яднанне можа адыграць «выключную ролю» ў сусветных справах.

Трамп заявіў, што яму можа пагражаць звыш 500 гадоў турмы

Былы прэзідэнт ЗША Дональд Трамп у лісце да дональ яго перадвыбарнай кампаніі выказаў здагадку, што ў рамках спраў, фігурантам якіх ён стаў за апошнія месяцы, яго могуць прыгаварыць да 561 года турэмнага зняволення з-за «паляванне на ведзьмаў», паведаміла The Hill. «Карумпаваны Мінюст ЗША, знаходзячыся пад кантролем жулікаватага Джо (прэзідэнта ЗША Джо Байдэна. — **«Зв.»**), зноў прад'явіў мне абвінавачанні», — напісаў Трамп. За апошнія месяцы яму прад'явілі абвінавачанні па трох справах. Гаворка ідзе аб штурме дэманстрантамі Капітолія, незаконным захоўванні сакрэтных дакументаў, а таксама аб меркаваных парушэннях, звязаных з бізнесам былога прэзідэнта. Трамп не прызнае сябе вінаватым. Як паведамлялася, апытанні сведчаць, што судовыя разборы не ўплываюць на палітычныя перспектывы экс-прэзідэнта: ён упэўнена апярэджвае па папулярнасці ўсіх астатніх удзельнікаў праймерыз ад Рэспубліканскай партыі. Такім чынам, як адзначаюць СМІ, яго шанцы перамагчы ў барацьбе за вылучэнне кандыдатам у прэзідэнты ад рэспубліканцаў вялікія. Як вядома, наступныя выбары кіраўніка дзяржавы пройдуць у ЗША налета.

У Каталоніі з-за засухі ўвядуць надзвычайны рэжым

Улады Каталоніі аб'явілі аб рашэнні ўвесці рэжым надзвычайнай сітуацыі з-за засухі ў 24 муніцыпалітэтах — там абмяжуюць выкарыстанне вады. Аб гэтым паведаміла агенцтва Associated Press. Меры ўступяць у дзеянне на наступным тыдні. Яны закрануць выкарыстанне вады ў сельскагаспадарчай сферы і ў прамысловасці, але не закрануць пітную ваду. Забароняць напаўненне басейнаў і грамадскіх фантанаў, а таксама паліў садоў і паркаў. Таксама гэта датычыцца і мыцця аўтамабіляў. Выкарыстанне вады для арашэння ў сельскагаспадарчай галіне рэгіёна скароцяць на 80 працэнтаў і на 25 працэнтаў — у прамысловасці.

Грамадзянская супольнасць

Аддача павінна быць вышэйшай

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА правёў сустрэчу з актывам БРСМ

Для ўдзелу ў размове былі запрошаны кіраўнікі структурных падраздзяленняў БРСМ з розных рэгіёнаў краіны, а таксама прадстаўнікі ячэек ВНУ.

«Відавочна, што БРСМ расце, прырастае, у тым ліку і добрымі справамі, расце аўтарытэт арганізацыі, яе пазнавальнасць», — сказаў Ігар Сергеенка. Але разам з тым ён звярнуў увагу і на існаванне недахопаў у рабоце, адзначыўшы, што пры той падтрымцы, якую аказвае дзяржава, і наяўных рэсурсах аддача павінна быць вышэйшая.

Падчас сустрэчы кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта абазначыў асобныя недахопы ў рабоце БРСМ, прапанаваў абмеркаваць, што перашкаджае, дзе трэба актывізавацца, аказаць дадатковую падтрымку, паведамляе БелТА.

Ён паказаў на неабходнасць правядзення больш актыўнай дзейнасці па навучанні кадраў. Пакуль прыкладаў правядзення навучальных семінараў сярод актыву БРСМ — адзінкі. «Сістэму навучання кадраў усіх узроўняў трэба больш дакладна выбудаваць, сістэматызаваць», — упэўнены Ігар Сергеенка.

Асобную ўвагу ён удзяліў пытанню падрыхтоўкі лідараў з маладзёжнага асяроддзя для іх наступнай работы ў сістэме ідэалагічнай «вертыкалі» і на дзяржаўнай службе, на прадпрыемствах, у іншых структурах. Паводле яго слоў, апошнім часам намецілася станоўчая тэндэнцыя ў дадзенай сферы — на работу толькі ў бягучым годзе ў сістэму ідэалагічнай «вертыкалі» гар- і райвыканкамаў прынята 15 работнікаў БРСМ.

У цэлым наладжана ўзаемадзеянне паміж БРСМ і мясцовымі органамі ўлады ў рэалізацыі маладзёжнай палітыкі, адзначалася на сустрэчы. «Цікавасць з боку ўлады відавочная, але толькі ў тым выпадку, калі вы прыходзіце з канкрэтнымі прапановамі, праектамі. Упэўнены, што вы заўсёды будзеце пачутыя», — заявіў Ігар Сергеенка.

Гаворка на сустрэчы ішла, безумоўна, і аб праектнай дзейнасці БРСМ. «Так, у вас наладжана гэтая работа, — сказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Ёсць удалыя прыклады, іміджавыя, якія сталі брэндавымі ў краіне: «100 ідэй для Беларусі», студатрадаўскі рух, «Каралева Вясна», «Добрае сэрца», «Зарніца» і іншыя. Папулярнасць атрымаў праект «Сіла закона» па абмеркаванні законапраектаў. Менавіта рэалізацыя такіх праектаў з'яўляецца асноўнай дзейнасцю для БРСМ, таму што гэта спрыяе пазнавальнасці, выхаванню моладзі, прыцягненню ў шэрагі арганізацыі. Але назіраецца паступальнае зніжэнне рэйтынгу раней папулярных праектаў, напрыклад, «Уладар вёскі», хоць альтэрнатыўных ініцыятыў па рабоце з сельскай моладдзю няма. Чаму праблемы?»

Пытанні арганізацыі дадзенага конкурсу і спосабы адрадзіць яго папулярнасць падрабязна абмяркоўваліся на сустрэчы, былі выпрацаваны сумесныя рашэнні па трансфармацыі спаборніцтва, у тым ліку па пашырэнні кола ўдзельнікаў конкурсу за кошт жыхароў пасёлкаў гарадскога тыпу.

Па ўсіх абазначаных пытаннях і выказаных заўвагах адбылося падрабязнае абмеркаванне, дыскусія з удзелам адказных асоб актыву БРСМ, у тым ліку прадстаўнікоў розных рэгіёнаў.

Былі прааналізаваны прычыны і намечаны спосабы вырашэння праблем. Асаблівую ўвагу Ігар Сергеенка даручыў звярнуць на актывізацыю дзейнасці актыву БРСМ у гарадах з колькасцю насельніцтва ад 80 тысяч чалавек, у тым ліку ў Пінску, Полацку, Лідзе, Маладзечне.

«Будзем лічыць, што першае знаёмства ў такім фармаце адбылося», — сказаў, падводзячы вынікі, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта і прапанаваў працягнуць правядзенне падобных сустрэч на рэгулярнай аснове.

НЕ КОЛЬКАСЦЮ, А ШТОДЗЁННАЙ РАБОТАЙ

Так, на думку спікера Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ, павінны заваёўваць аўтарытэт грамадскія арганізацыі

Падчас рабочай паездкі ў Гомель Старшыня Савета Рэспублікі правяла сустрэчу з актывам Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага саюза жанчын. Сустрэча праходзіла ў СЭЗ «Гомель-Ратон». Яна аб'яднала больш за дзвесце жанчын з усіх куткоў паўднёвага ўсходу краіны.

Наталля Качанава звярнула ўвагу: такая сустрэча з актыўнымі рэгіёна трэцяя па ліку — пасля Гродна і Брэста. На думку спікера, сістэма інфармацыйных сустрэч з калектывамі ў краіне выбудавана сур'ёзна. Гэта і адзіныя дні інфармавання, і сустрэчы на прадпрыемствах, і прыёмы па асабістых пытаннях. Наталля Качанава адзначыла таксама важнасць стасункаў з людзьмі, якія займаюць актыўную грамадзянскую пазіцыю, — з прадстаўнікамі жаночай, маладзёжнай, іншых арганізацый.

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла важкую ролю грамадскіх арганізацый у вырашэнні розных пытанняў. «І мы павінны браць не колькасцю (хоць чым больш аднадумцаў, тым лепш), але праектамі, той штодзённай работай, якая будзе даваць вынік», — перакананая яна. «Усё павінна працаваць эфектыўна. І на карысць дзяржавы, чалавека. Тады і ў людзей будзе давер», — дадала спікер.

Наталля Качанава звярнула ўвагу: у краіне дакладна выбудавана сістэма арыенціраў далейшага развіцця дзяржавы і работы кожнага — VI Усебеларускім народным сходам, Пасланнем Прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу.

Спікер падкрэсліла, што ў Беларусі цяпер ідзе актыўная работа над рэалізацыяй навацый, якія былі ўнесены ў Канстытуцыю. «Была распрацавана праграма прывядзення законапраектаў у адпаведнасць з новай Канстытуцыяй. І 88,9 працэнта практычна ўжо выканана. Засталося сем законапраектаў. На восеньскай сесіі мы тэкучую работу завершым», — расказала яна. «Неабходна было ўнесці не толькі карэктывы, распрацоўвалі і новыя законапраекты. Мы распрацавалі новы закон аб Усебеларускім народным сходзе», — дадала Наталля Іванаўна.

Паводле яе слоў, форма УНС — не новая для Беларусі. «Мы правялі ўжо шэсць сходаў. Але раней гэта быў дарадчы орган. Калі праводзіўся першы Усебеларускі народны сход, Прэзідэнт казаў, што галоўнае — адвесці краіну ад бездані. Цяпер мы ўбачылі: УНС нам патрэбен як пастаянна дзеючы орган, вышэйшы орган народаўладдзя. Каб у такіх сітуацыях, як, напрыклад, былі ў 2020 годзе, калі нас спрабавалі паспытаць на зуб, калі спрабавалі нашу краіну разламаць, унесці раскол у грамадстве, паставіць на калені, УНС сабраўся і выказаў сваю пазіцыю, прыняў дакладнае рашэнне», — падсумавала Старшыня Савета Рэспублікі.

На сустрэчы спікера папрасілі падзяліцца меркаваннем, якім павінен быць дэлегат УНС, што прадстаўляе грамадскія арганізацыі. «Самае галоўнае — гэта павінен быць сумленны чалавек, які не баіцца выказваць сваё меркаванне і адстойваць пазіцыю ў вырашэнні пытанняў на карысць людзей. А яшчэ самае галоўнае — быць адданым палітыцы сваёй дзяржавы», — падкрэсліла Наталля Качанава. Яна адзначыла: «У цэнтры дзяржаўнай палітыкі — чалавек і яго інтарэсы. Таму і дэлегатам павінен быць толькі патрыёт сваёй краіны». Наталля Качанава нагадала, што дэлегат будзе мець асаблівы статус на пяць гадоў, магчымасць узаемадзейнічаць з усімі ведамствамі, дэпутатамі і іншымі службамі.

Таксама на сустрэчы спікер звярнула ўвагу на няпростую міжнародную абстаноўку, сітуацыю, якая складваецца па знешнім контуры краіны. «Але наша краіна ніколі не будзе агрэсарам. Гэта за мяжой нашай свядомасці. Мы заўсёды былі міралюбівай краінай. Мы заўсёды будзем рабіць усё, каб захаваць мір і спакой у нашай краіне і не перажыць тыя жахі вайны, якія выпалі на долю старэйшага пакалення», — зрабіла акцэнт Наталля Качанава.

Яна падкрэсліла: Беларусь заўсёды выступае толькі за мірнае ўрэгуляванне сітуацый. «І нам іншага не дадзена, як кожнаму адказна працаваць на сваім рабочым месцы і плюс мець грамадзянскую адказнасць за тое, што адбываецца ў краіне. І роля грамадскіх арганізацый, у тым ліку БСЖ, вельмі важная», — сказала Старшыня Савета Рэспублікі.

З просьбай перадаць падзяку кіраўніку дзяржавы за пераўтварэнне Петрыкава і рэалізацыю маштабнага вытворчага праекта звярнуліся да спікера прадстаўнікі раёна, адрасаваўшы пытанне аб тым, што можа зрабіць для захавання спакойнага жыцця ў краіне кожны беларус.

«Кожны беларус на сваім месцы можа зрабіць для міру ўсё, што ад яго залежыць, адказна выконваючы сваю работу», — адказала Наталля Качанава.

Старшыня Савета Рэспублікі нагадала аб падзеях 2020 года. «Чаму мы выстаялі ў 2020 годзе? У першую чаргу дзякуючы жорсткай пазіцыі нашага лідара. І цяпер наша задача, каб у Год міру і стваральнай працы людзі разумелі і шанавалі сваю краіну, дзяржаўную палітыку, працягваючы жыць і працаваць, стваральны выгады для сябе і дзяржавы. Каб захаваць мір на нашай зямлі, важны ўклад кожнага. Пакуль людзі будуць адчуваць падтрымку адзін аднаго, будзе мір», — акцэнтавала Наталля Качанава.

Паводле БелТА.

КАРАВАЙ ПЕРШАГА РЭГІЁНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

З працоўнай перамогай на мінулым тыдні яго прыязджалі павіншаваць **губернатар Юрый ШУЛЕЙКА, старшыня Дзяржкантролю Васіль ГЕРАСІМАЎ, кіраўнікі абласнога і раённага ўзроўню.**

Сцяпан Віктаравіч, хоць і прывык даваць інтэрв'ю (гэта не першы, а шаснаццаты (!) яго рэкорд на ўборачных кампаніях), але ўсё ж крыху хваляваўся, сказаў, што ўдзячны за падтрымку сям'і, калектыву, адзначыў таксама надзейную айчынную тэхніку.

А **першым тысячнікам-камбайнерам сёлета на Брэстчыне стаў механізатар ААТ «Баранавіцкая птушкафабрыка» Сяргей КАЛЯНКОВІЧ.** Сяргей — вопытны механізатар, у гаспадарцы працуе з 1996 года. Спачатку быў памочнікам, а з 2008 года заступае за штурвал старшага камбайнера. На сваім камбайне John Deer, на якім працуе з 2015 года, не раз ставіў рэкорды. Цяпер у шэрагу дасягненняў яшчэ адно — першы тысячнік Брэсцкай вобласці. Перадавіка тады таксама прыязджаў павіншаваць кіраўнік Брэстчыны Юрый Шулейка.

І калі рубеж у тысячу тон скарыўся камбайнеру з самага паўночнага раёна вобласці, то двухтысячную адзнаку ўзялі паўднёвыя хлебаробы — экіпаж са Столінскага раёна ў складзе **камбайнера Уладзіміра ВЯРЭНІЧА** і яго **памочніка Канстанціна МАЛЕЯ.** Механізатары з сельгаспрадпрыемства «Відзіборскі» намалацілі дзве тысячы тон на айчынным камбайне КЗС-1218.

Дарэчы, флагман беларускага камбайнабудавання не абмінуў сваёй увагай чарговую перамогу бітвы за ўраджай. «Гомсельмаш» па традыцыі праводзіць спаборніцтва сярод механізатараў, якія ўбіраюць хлеб, і адзначае пераможцаў. Прадстаўнікі завода прыехалі ў «Відзіборскі» і ўручылі падарункі перадавому экіпажу па выніках яго намалоту — першай тысячы тон.

З другой тысячай Уладзіміра і Канстанціна павіншавалі **першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Валянцін ЗАЙЧУК** і **старшыня Столінскага райвыканкама Рыгор ПРАТАСАВІЦКІ.**

Валянцін Зайчук уручыў перадавікам падзякі старшыні аблвыканкама, грашовыя прэміі, прадугледжаныя ўмовамі спаборніцтва. Віцэ-губернатар адзначыў, што Столінскі раён па ўсіх кірунках аграпрамысловага комплексу дэманструе ўстойлівую станоўчую дынаміку.

Прадпрыемства «Відзіборскі» мае адзін з найлепшых паказчыкаў у раёне і вобласці па ўраджайнасці збожжавых, з гектара тут збіраюць амаль 62 цэнтнеры. Століншчына, як і летась, лідзіруе ў вобласці па тэмпах уборкі. Летась аграрыі раёна

Камбайнеры КСУП «Відзіборскі» Уладзімір ВЯРЭНІЧ і Канстанцін МАЛЕЙ.

завяршылі жніво 9 жніўня, а 14-га ўжо справілі раённыя «Дажынкі». Сёння ўбрана каля 75 працэнтаў збожжавых. Уборачная плошча ў раёне складае 19 тысяч гектараў. Сярэдняя ўраджайнасць — 47,2 цэнтнера з гектара, а гэта на 1,7 цэнтнера больш за леташні паказчык.

Да візіту Прэзідэнта на Брэстчыну кандытары выпеклі адмысловы каравай з мукі новага ўраджаю з характэрным надпісам «Першы каравай першага рэгіёна». Агульны абласны каравай ужо ўпэўнена перавысіў 600 тысяч тон.

Святлана ЯСКЕВІЧ. Фота Валерыя КАРАЛЯ і Telegram-канала Брэсцкага аблвыканкама.

Напярэдадні

Чытачам Гарадка і Гарадоччыны — падарунак ад пісьменнікаў

Новая кніжная ініцыятыва стартавала ў пярэдадзень правядзення XXX Дня беларускага пісьменства ў Гарадку, які адбудзецца 2—3 верасня 2023 года. У новую сталіцу традыцыйнага свята прыехала дэлегацыя Саюза пісьменнікаў Беларусі з бібліятэкай кніг у падарунак ад літаратараў краіны.

Удзел ва ўрачыстай цырымоніі ў Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы ўзяў **намеснік міністра інфармацыі Ігар БУЗОЎСКІ.** Выступаючы перад гаспадарамі і гасцямі кніжнага свята, ён адзначыў ролю друкаванай кнігі ў патрыятычным, духоўным выхаванні грамадства. Расказаў пра шырокамаштабную работу дзяржавы, непасрэдна Міністэрства інфармацыі, у плане падтрымкі айчыннага кнігавыдавецтва. Намеснік міністра інфармацыі выказаў надзею, што Дзень беларускага пісьменства ў Гарадку прыўнясе шмат новага, самыя неспадзяваныя культурна-асветныя навацыі ў жыццё Гарадка, Гарадоцкага раёна. Старшыня Гарадоцкага райвыканкама Ірына Палякова, дырэктар Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі Ада Абрамава падзякавалі за такі шчодры, знакавы кніжны падарунак ад пісьменнікаў літаральна ўсёй краіны.

Каментуючы падзею, **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** адзначыў, што ў горад — новую сталіцу Дня беларускага пісьменства літаратары прывезлі звыш 400 кніг, калі быць дакладнымі — 417 экзэмпляраў кніг сучаснай паэзіі, прозы, публіцыстыкі, краязнаўства. У бібліятэчцы, якая дастаўлена з Мінска, — кнігі з аўтографамі. Свае пажаданні чытачам напісалі Мікалай Чаргінец, Іна Фралова, Алена Стэльмах, Кацярына Хадасевіч-Лісавая, Сяргей Трахімёнак, Генадзь Аўласенка, Ганна Чыж-Літаш, Алесь Бадак, Віктар Шніп, Уладзімір Мазго, Міхась Пазнякоў, Мікола Чарняўскі, Ірына Карнавуха-ва і шмат хто яшчэ. Паэты, празаікі, публіцысты пакінулі самыя цёплыя, сардэчныя словы пажаданняў у адрас чытачоў такога прыкметнага куточка віцебскай старонкі. Акцыя такога характару ў наступныя гады пройдзе і ў іншых сталіцах Дня беларускага пісьменства. А яшчэ кіраўнік творчай арганізацыі паабяцаў, што пісьменнікі краіны часцей будуць прыязджаць у Гарадок не толькі ў святочныя дні. У верасні і ў наступныя месяцы 2023 года з прэзентацыямі і аўтографсесіямі ў Гарадоцкі раён наведаюцца Кацярына Хадасевіч-Лісавая, Генадзь Аўласенка, Ганна Чыж-Літаш, Іна Фралова, Віктар Шніп і іншыя пісьменнікі, чые кнігі карыстаюцца папулярнасцю ў чытачоў Беларусі.

Расказваючы гасцям пра характар сённяшняй работы з чытачом, кіраўнік бібліятэкі Ада Абрамава звярнула ўвагу на тое, што ў наведвальнікаў ёсць асабліва запатрабаванне на адкрыццё новых кніг, якія носяць светлы, духоўны характар. Чытачы розных узроставых груп цікавяцца праваслаўнай літаратурай. Удзел у акцыі дарэння бралі і супрацоўнікі Выдавецкага дома «Звязда». Спецыяліст аддзела рэалізацыі кніжнай прадукцыі Людміла Драздова звярнула ўвагу на тыя кніжныя навінкі, якія выйдуць у «Звяздзе» ў найбліжэйшыя месяцы. У прыватнасці, гаворка ішла пра кнігу гродзенскага краязнаўца Святланы Кошур «Праз паціну часу: сцежкамі Свіцязянскай зямлі», публіцыстычную кнігу рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта доктара педагагічных навук Андрэя Караля «Дарогі vs сэнсы: адукацыйныя заметкі», працяг мемуарнага цыкла «Цяжкія дарогі жыцця» Мікалая Чаргінца — свет маюць убачыць дзве кнігі народнага пісьменніка Беларусі; зборнік вершаў паэта Рагнеда Малахоўскага, кніга нарысаў журналісткі Ірыны Аўсеп'ян «Ведаем, ганарымся!», зборнік фантастычных апавяданняў Алёны Беланожкі «Дзіця Зямлі»... Безумоўна, усе гэтыя выданні трапяць і ў Гарадок. Дарэчы, на XXX Дні беларускага пісьменства ў Гарадку будзе прэзентавана новая кніга Уладзіміра Ліхадзедава з серыі «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага» — «Ад Віцебска да Полацка», у якой сабраны рэпрадукцыі старых паштовак пра гарады і іншыя паселішчы Віцебшчыны. Ва ўдзельнікаў свята будзе магчымасць, адкрыўшы старонкі філакартычнага альбома, ажыццявіць віртуальнае падарожжа па розных куточках Віцебскай вобласці.

Кастусь ЛЕШНІЦА.
Фота Кастуся ДРОБАВА.

ФАРМАТ СПАБОРНІЦТВАЎ — АДКРЫТЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Усіх гасцей сустракаюць валанцёры, якія валодаюць замежнымі мовамі, працуюць яны не толькі ў аэрапорце, але і на аб'ектах правядзення спаборніцтваў.

— II Гульні краін СНД унікальныя тым, што спаборніцтвы пройдуць не толькі ў сталіцы, але і ў рэгіёнах нашай краіны, — адзначыў Аляксандр Дараховіч.

Ва ўдзельнікаў і гасцей ёсць магчымасць наведаць спартыўныя аб'екты, азнаёміцца са славутасцямі Беларусі.

— Мы ўсе рыхтаваліся да правядзення Гульняў. Спадзяёмся, што СМІ шырока асветляць правядзенне спаборніцтваў і ў нашу краіну прыедзе яшчэ больш гасцей, — сказаў Аляксандр Дараховіч.

Ва ўсіх відах спорту будуць удзельнічаць каманды Расіі, Беларусі, Узбекістана, — распавёў журналістам **намеснік міністра спорту і турызму Аляксандр БАРАУЛЯ.** — Дэлегацыя нашай краіны прадстаўлена 673 спартсменамі, Расія — 602. На трэцім месцы па колькасці прадстаўнікоў — дэлегацыя Узбекістана. У большасці відаў спорту выступяць юніёры і моладзь, але ў пяці відах — пляжным футболе, цяжкай атлетыцы, самба, хакеі на траве і мастацкай гімнастыцы — за ўзнагароды паспрачаюцца асноўныя саставы зборных.

Таксама намеснік міністра адзначыў высокі ўзровень чаканай канкурэнцыі ў асобных відах спорту.

— На спаборніцтвах па пляжным футболе выступяць восем камандаў, пяць з іх — будучыя ўдзельнікі чэмпіяната свету ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах. У мастацкай гімнастыцы гледачы ўбачаць ужо класічнае супрацьстаянне Беларусі і Расіі, таксама моцныя саставы прывезлі Азербайджан і Узбекістан. Добра прадстаўлена і цяжкая атлетыка, сур'ёзная барацьба чакаецца ў самба, дзе будуць удзельнічаць рэгулярныя прызёры буйных міжнародных форумаў, у прыватнасці, зборная Манголіі, — сказаў Аляксандр Барауля.

Ён падзяліўся з журналістамі чаканнямі напярэдадні старту II Гульняў краін СНД

— Настрой святочны, але адчуваецца і вялікая адказнасць. Адной з «разыначак» мультыспартыўнага форуму стане цырымонія адкрыцця, але я б не хацеў цяпер раскрываць усе падрабязнасці. Магу сказаць толькі, што мы пакажам на ёй як глыбіню нашай беларускай культуры, так і сучасную Беларусь. Гэта будзе ярка, відовішчна і запомніцца надоўга. Усе гледачы і члены дэлегацый, упэўнены, ацэняць яе, — сказаў Аляксандр Барауля. — Што датычыцца спартыўнай праграмы, можна вылучыць унікальныя аб'екты, дзе будуць праходзіць старты. Так, спаборніцтвы па тайландскім боксе ў Віцебску адбудуцца на пляцоўцы Летняга амфітэатра. На мінулым тыдні мы правялі там тэставыя спаборніцтвы, і гэта глядзелася выдатна. Аматары згаданага віду спорту, якія наведаюць турнір, відавочна не пашкадуюць.

Таксама намеснік міністра расказаў аб культурнай праграме для атлетаў і гасцей нашай краіны:

— У кожным з рэгіёнаў у нас падрыхтаваны турыстычны план для балельшчыкаў, якія будуць прыбываць у Беларусь падчас Гульняў. Мы гатовыя паказаць усю прыгажосць нашай краіны, у прыватнасці, яе запаведныя мясціны. У тым ліку прадугледжана праграма для спартсменаў, бо для іх гэта таксама ўнікальная магчымасць паглядзець нашы культурныя і гістарычныя аб'екты, якіх у нас дастаткова.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

❍ У тэму

ГУЛЬНІ ПАД НАДЗЕЙНАЙ АХОВАЙ

Да правядзення Гульняў актыўна рыхтуюцца не толькі спартсмены, але і праваахоўныя органы. Яны перайшлі на ўзмоцнены варыянт нясення службы на час II Гульняў краін СНД. Пра гэта напярэдадні паведаміў **начальнік галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў Аляксандр КУПЧЭНЯ.**

Паводле яго слоў, для адпрацоўкі сумесных дзеянняў па ахове правапарадку на кожным аб'екце Гульняў у ліпені праведзены заняткі і трэніроўкі. На перыяд правядзення спаборніцтваў асабовы склад органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў пераводзіцца на ўзмоцнены варыянт нясення службы. На асаблівы кантроль тэрыторыі паблізу месцаў правядзення II Гульняў краін СНД возьме ДАІ. Пры неабходнасці будзе арганізавана суправаджэнне груп спартсменаў.

Ніводнае месца правядзення мерапрыемстваў не застанецца без увагі праваахоўнікаў, запэўніў Аляксандр Купчэня. Гэта месцы пражывання ўдзельнікаў і гасцей, месцы харчавання, фан-зоны, якія будуць арганізаваны на некаторых аб'ектах, іншыя грамадскія месцы з масавым знаходжаннем грамадзян.

Аляксандр Купчэня таксама адзначыў: людзям не варта турбавацца, што нейкія злачынныя элементы на падставе прыбыцця на Гульні трапяць у краіну.

— Усе асобы, якія да нас прыбываюць, прайшлі працэдуру акрэдытацыі. Усе яны праверэныя па ўліках. Мы загадзя правялі такую працэдуру, таму кожны ўдзельнік мерапрыемства праверэны намі.

Дарэчы

Парыж з рахункаў не спісваецца

Журналісты пацікавіліся, як ідзе падрыхтоўка беларускіх спартсменаў да Алімпіяды 2024 года ў Парыжы.

— Усе нашы каманды вядуць падрыхтоўку зыходзячы з умоў, якія былі пастаўленыя міжнароднымі федэрацыямі. У нейкіх відах спорту мы ўдзельнічалі ў кваліфікацыйных спаборніцтвах, па нейкіх яшчэ не атрымалі адказу. Але падрыхтоўка ідзе ў тым рэжыме, у якім планавалася, — сказаў Аляксандр Барауля.

Намеснік міністра адзначыў, што многае залежыць ад рашэнняў, якія будуць прынятыя міжнароднымі федэрацыямі.

— Нашы прадстаўнікі знаходзяцца ў кантакце з імі. Мы вядзём планамерную работу па падрыхтоўцы і гатовыя выступаць, калі будзе прынята рашэнне аб допуску, — падагульніў Аляксандр Барауля.

Надвор'е

Жнівень вырашыў нас «расплавіць»

У суботу будзе даходзіць да 36 градусаў, а ў нядзелю — усе 37!

Сіноптыкі абвясцілі аранжавы ўзровень небяспекі з-за спёкі адразу на працягу трох дзён. Спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды адзначаюць, што ў пятніцу, суботу і ў нядзелю нам будзе асабліва цяжка з-за анамальна павышаных тэмператур.

Ужо ў пятніцу чакаецца пераменная воблачнасць. Ноччу і раніцай на большай частцы тэрыторыі краіны, днём пераважна па паўднёвым усходзе пройдуць кароткачасовыя дажджы. Месцамі чакаюцца навальніцы. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах магчымы туман. Вецер пратрасуецца паўднёва-заходні, паўднёвы 4—9 м/с, месцамі з парывамі да 14 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 13—19 градусаў вышэй за нуль. Днём будзе 24—29 цяпла, па паўднёвым усходзе — плюс 30—33 градусы.

У суботу ноччу пераважна па поўдні, а днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у дзённыя гадзіны месцамі моцныя дажджы. У асобных раёнах магчымыя навальніцы. Удзень месцамі чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 13 на паўночным захадзе да 21 градуса на паўднёвым усходзе. Днём будзе ад 22 па паўночным захадзе да 34 градусаў па паўднёвым усходзе краіны, месцамі па Гомельскай вобласці — да 36 градусаў гарачыні.

У нядзелю пераважна ў заходніх раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Месцамі чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 17—23 градусы. Днём будзе 29—34 цяпла, а ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях на большай частцы тэрыторыі слупок тэрмометра паднімецца да 35—37 градусаў.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, у панядзелак на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы, месцамі моцныя дажджы, навальніцы, магчымы град. У асобных раёнах чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ноччу складзе ад плюс 14 па паўднёвым захадзе да 26 цяпла па паўночным усходзе. Днём будзе 18—25 градусаў, па паўночным усходзе — 26—33 градусы.

У аўторак месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Днём у асобных раёнах чакаюцца навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 7—13 градусаў, удзень — 17—24 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

Кіно на выхадныя

Трэба проста любіць і верыць

На тэлеканале АНТ 5 жніўня згадаем акцёра Анатоля Папанава. Менавіта ў гэты дзень 1987 года вялікі артыст пайшоў з жыцця. Для прыхільнікаў яго творчасці тут запланаваны паказ дакументальнага фільма пра Анатоля Дзмітрыевіча і кінастужкі «Прыходзьце заўтра...», якая сёлета адзначае 60-годдзе.

Музычная камедыя пра Фросю Бурлакову, вядомая многім, была знятая рэжысёрам Яўгенам Ташковым у 1963 годзе. Дарэчы, вобраз галоўнай гераіні ў кадры ўвасобіла Кацярына Савінава (жонка Ташкова). Сумесна яны працавалі і над сцэнарыем будучага фільма. А Анатолю Папанаву ў ім даставалася роля скульптара.

Анатоль Папанаў — яркі, таленавіты, любімы. Яго імгненна пазнавалі па непаўторным голасе. Многія і дагэтуль памятаюць нават невялікія яго ролі. А сам Анатоль Дзмітрыевіч шчыра здзіўляўся, як са сваёй знешнасцю і вымаўленнем стаў акцёрам. Ён не быў задаволены ніводнай сваёй кінаработай, называючы сябе «памылкай рэжысёраў». Стваральнікі дакументальнага фільма «Трэба проста любіць і верыць» сабралі разам сям'ю Анатоля Папанава: дачку Алену з унучкамі Марыяй і Надзеяй, якія ўпершыню падзяліліся ўспамінамі пра дзядулю. Таксама зазірнулі і ў сямейны архіў акцёра. Усе, хто ведаў Анатоля Папанава, казалі, што ён здольны кахаць толькі адну жанчыну — сваю жонку Надзею. Яны пражылі разам 43 гады. Абое прайшлі вайну і глядзелі ў вочы смерці. Менавіта размова пра перажытае на фронце некалі звяла двух будучых студэнтаў акцёрскага факультэта. Яркімі ўспамінамі падзялілася Надзея Юр'еўна са здымачнай групай, іх таксама ўбачым у фільме. Што да кіно, то яно прыйшло ў жыццё Анатоля Папанава, калі яму было ўжо амаль сорак гадоў. І адкрыў яго ў 1960 годзе для сваіх калег-рэжысёраў Эльдар Разанаў, калі прапанаваў акцёру зняцца аж у чатырох ролях у сваёй трагікамедыі «Чалавек ніадкуль». Пасля ўжо з'явяцца фільмы з яго ўдзелам «Сцеражыся аўтамабіля», «Брыльянтавая рука», «Бацькі і дзяды», «Жывыя і мёртвыя» і многія іншыя. Яго кінаработы і сёння хочацца пераглядаць, бо кожная з іх шчырая — якім і быў па жыцці іх выканаўца.

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 197

№ 114

Сённяшнія кампазіцыі складзеныя вядучым рубрыкі.

№ 114

Белыя простыя: c1, e1, b2, h2, b6, c7, e7 (7)

Чорныя простыя: g3, b4, d4, f4, g5, f6, a7, g7, d8 (9)

№ 115

Белыя простыя: f2, d4, h4, e5, b6, c7 (6)

Чорныя простыя: b4, f6, a7, e7, g7, d8 (6)

№ 116

Белыя простыя: c3, e3, b4, d4, h4 (5)

Чорныя простыя: f4, g5, b6, f6, e7, g7, d8 (7)

№ 117

Белыя простыя: f2, e3, b6, d6, e7 (7)

Чорныя простыя: b2, h2, b4, g5, a7, g7 (6)

№ 118

Белыя простыя: b2, a3, e5, b6, d6, h6 (6)

Чорныя простыя: d2, e3, g3, f4, g7, f8 (6)

№ 119

Белыя простыя: 47, 49, 41, 43, 33, 21, 17, 11, дамкі: 22 (9)

Чорныя простыя: 32, 34, 24, 3, дамкі: 46, 48, 6 (7)

№ 120

Белыя простыя: 44, 37, 31, 27, 21, 17, 12, дамкі: 48 (8)

Чорныя простыя: 45, 36, 23, 24, 13, 14, дамкі: 6, 3 (8)

№ 121

Белыя простыя: 44, 37, 31, 27, 22, 23, 17, 12, дамка: 48 (9)

Чорныя простыя: 45, 36, 24, 13, 14, 10, дамка: 6, 3 (8)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Міжнародны гросмайстар Аркадзь Плакхін перамог у XXV адкрытым раённым турніры па шашках-64 «Мар'іна Горка — 2023» памяці В. Р. Габрыеляна.

У аг. Жыровічы (Слонімскі раён) праходзіў XIII рэспубліканскі турнір па шашках-100, прысвечаны Дню вызвалення Слоніма. Наймацнейшай стала майстар Вікторыя Нікалаева (Мінск).

Анонс: з 11 да 13 жніўня ў Драгічыне адбудзецца XXXII адкрыты рэспубліканскі турнір па шашках-64 «Етвызь-2023». Даведкі па тэлефоне 80297277318, Нагурны Васіль.

Праверце свае рашэнні

Выпуск № 196 ад 21.07.2023.

№ 106

1. f6-g7 e3:c1 2. g5-f6 c1:g5 3. h6:f4 f8:h6 4. e1-d2 c3:e1 5. h4-g5 e1:h4 6. a1-b2 a3:c1 7. e7-d8 c5:e7 8. d8:d2 c1:e3 9. f6:d8 h4:f6 10. d8:h4 e3:g5 11. h4:d8+

№ 107 1. a7-b8 e7:e3 2. b4-c5 d6:b4 3. b8:c3 b4:d2 4. b6-c7 d8:b6 5. a5:c7 f2-g1 6. c7-b8 h4:f2 7. b8-h2+ Праблема супала з раней апублікаванай у «Спартыўнай панараме» 15.02.15 з пазіцыяй В. Бяляўскага, паведаміў Ю. Голікаў.

№ 108 1. g7-h8 f4:h6 2. h4-g5 h6:f4 3. f6-g7 d8:f6 4. g7:g3

[4.g7:c7 e3-d2=] h2:f4 5. h8:h2 e3-d2 6. c1:e3+

18.05 «Веды ў кубе».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.40 «Маладыя таленты Беларусі».

Беларусь 5

7.00 ІІ Гульні краін СНД.
8.40 Між іншым.
9.00, 16.35, 18.05 «У цэнтры Гульняў».
9.55 ІІ Гульні краін СНД. Вольная барацьба. Цяжкая атлетыка. Мужчыны 102 кг, 109 кг, +109 кг. Стральба з лука.
15.25, 16.55, 18.25, 1.50 ІІ Гульні краін СНД. Пляжны футбол.
19.30 ІІ Гульні краін СНД. Міні-футбол. Беларусь — Кыргызстан. У перапынку — «У цэнтры Гульняў».
21.30 ІІ Гульні краін СНД. Вольная барацьба.
23.35 Вынікі дня.
23.55 ІІ Гульні краін СНД. Міні-футбол. Азербайджан — Узбекістан.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30 Нашы навіны.
10.00 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Белыя росы» (12+).
11.50, 13.15 Фільм «Пасведчанне аб нараджэнні» (16+).
14.00, 22.35 Фільм «Тэст на цяжарнасць-2» (16+).
16.20 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
19.00 «Аб'ектыўНа» (16+).
20.00, 0.35 Час.
21.15 «Усё зразумела з Марынай Караман» (16+).
21.25 Фільм «Казанова» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00, 0.55 Дак. праект. Без падману (16+).
10.40 «Ленінград 46». Серыял (16+).
11.30 Дак. праект. Закулісныя войны (16+).
13.50 «Падсудны». Серыял (16+).
16.50 «Рэалізацыя». Серыял (16+).
20.15, 23.05 «СТБ-спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Міншчына».
20.40 «Ствараем разам».
20.50 «Выкідала». Серыял (16+).
23.20 «Азаронак. Напрамую».
1.40 «Акадэмія». Серыял (16+).

МІР

5.00, 10.10 Серыял «Братаны-3» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 18.30, 2.35 Навіны (бягучы радок).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
16.15 «Прысуд!?» (16+)
17.10 «Міравое пагадненне» (16+).
18.50 «Гульня ў кіно» (16+).
21.35 «Назад у будучыню» (16+).
22.25 «Сусветныя гульні розуму» (16+).
23.00 Маст. фільм «Змеялоў» (16+).
0.50 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
1.10 Маст. фільм «Музычная гісторыя» (16+).
2.50 «Спецыяльны рэпартаж» (12+).
3.00 [Не]Фантастыка (12+).
3.15 «Каханне без меж» (16+).
4.00 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).

РТР—Беларусь

6.00 «Новая раніца».
10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00 Беларусь. Навіны.
10.05, 17.40 Фільм «Сямнаццаць імгненняў вясны».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.40 «Пра самае галоўнае» (12+).
12.50 «Кропкі над і» (16+).
14.40 «60 хвілін».
18.45 «Малахай» (16+).
20.20 «Так! Але...»
21.30, 23.15 Серыял «Лавец сноў» (12+).
23.40 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.15, 8.20, 13.25, 16.45, 19.55 Сёння. Галоўнае.
6.10 «Здорава здаровым быць!» (6+)
6.55 Сфера інтарэсаў.
7.30 «Маршрут пабудаваны» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.20, 23.20 Сёння.
8.35, 21.05 «НЗ.by».
8.55, 10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Рубяжы радзімы» (16+).
11.15 Серыял «Дэльта» (16+).
13.30 Надзвычайнае здарэнне.
13.55 Серыял «Дзікі» (16+).
16.50 Серыял «Хуткая дапамога» (16+).
20.10, 21.25, 22.25, 23.35 Серыял «Стэпавыя ваўкі» (16+).

8 канал

7.00, 17.55 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад.
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Дэтэктыў «Паляўнічыя на караваны» (12+)
8.20 Дак. серыял «Загадкі гісторыі».
9.05 Мультфільм.
9.25 Прыгоды «Парк Юрскага перыяду-2» (16+).
11.35 Дэтэктыў «Выклік» (16+).
13.05 Серыял «Яна напісала забойства» (12+)
13.55 Меладрама «Чужое жыццё» (12+).
15.25 Трылер «Смерць сярод айсбергаў» (16+)
17.00 Дак. серыял.
18.00 Серыял «Кветка зла» (16+).
19.05 Драма, трылер «Барон» (16+).
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.00 «Фэшн is my прафэшн» (12+).
21.10 «Урокі Лазуркіна».
21.15 «Надвор'е».
21.20 Драма «Голад» (16+).
23.40 Дэтэктыў «Цень» (16+).

Культура

6.30 «Пешшу...»
7.05 Легенды сусветнага кіно.
7.35, 16.15 Рэпартажы з будучыні.
8.15 «Выццё і лёс».
8.35, 23.20 «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
8.50 «Пецька ў космасе». Маст. фільм.
10.00, 12.30, 17.00, 19.30 Навіны культуры.
10.15 «Археалогія. Гісторыя з рыдлёўкай». Дак. серыял.
10.45 «Горад над галавой». Маст. фільм.
12.00, 18.15 Раман у камені.
12.45 Зямля людзей.
13.15 Прыступкі цывілізацыі.
14.05 «Забытае рамяство». Дак. серыял.
14.20 «Святыні Крамля». Дак. серыял.
14.50, 22.00 «З жыцця адпачывальнікаў». Маст. фільм.
17.15, 1.25 Майстар-клас.
18.45 «Прастольнае свята. Дзень Мікалая Цудатворца». Дак. фільм.
19.45 «Смеханастальгія».
20.15 Шукальнікі.
21.00 Лінія жыцця.
23.35 «Спрут- 4». Серыял.
2.25 Мультфільмы для дарослых.

Настальгія

6.00 «Спяем, сябры!» (12+)
7.00 Маст. фільм «Хаціна на нябёсах» (18+).
8.35, 9.40, 11.30, 15.40, 17.30, 19.05, 20.50, 21.40, 0.45, 2.45, 3.40, 5.50 Музычная настальгія (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
11.00, 17.00, 23.00, 5.15 «Блеф-клуб» (16+).
12.00 Маст. фільм «Бласлаўёная зямля» (16+).
14.20 «Ад смешнага да вялікага. «Двое з куфэрка (16+).
18.00 «Да і пасля...» (16+)
19.15 Маст. фільм «Страчаны ўік-энд» (18+).
23.00 «Блеф-клуб». 1996 год (16+).
0.00 «Быў час» (16+).
1.10 Маст. фільм «Абгаваранная» (16+).

EuroSport 1

4.00 Мотагонкі на выносліваць (6+).
6.00 Веласпорт. Мікст (16+).
7.00, 19.30, 1.30 Веласпорт. Жанчыны (16+).
8.00, 10.45, 15.15 Маўнцінбайк. Мужчыны (6+).
8.45, 15.45 Маўнцінбайк. Жанчыны (6+).
9.30 Усе віды спорту (6+).
9.45 Трыятлон (6+).
16.15, 23.30, 0.30 Веласпорт. Мужчыны.
20.00, 2.30 Скалалажанне. Жанчыны.
23.00 Скалалажанне. Мужчыны і жанчыны (0+).

Кінакамедыя

0.35, 13.40 «Рэд-2» (12+).
2.35 «Капальні цара Саламона» (12+).
4.20 «Твае, мае і нашы» (6+).
5.55 «Робін Гуд: пачатак» (16+).
8.00 «Невынішчальны шпіён» (16+).
9.35 «Жаніх напракат» (16+).
11.40 «Рэд» (16+).
15.50 «Дзядуля нялёгкіх паводзін» (6+).
17.35 «Пікселі» (12+).
19.30 «Вялікі куш» (16+).
21.25 «Куленепрабівальны» (12+).
23.15 «Ну, добры дзень, Аксана Сакалова!» (16+)

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.20 «Неверагоднае перамяшчэнне» (6+).
10.55 «Паглядзім» (12+).
11.25, 0.20 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.05, 18.30, 1.50 «Сляпая» (16+).
14.30, 19.30, 3.10 «Варажбітка» (16+).
15.55 «Сельскі дэтэктыў» (12+).
17.35 «Знакі лёсу» (16+).
20.30 «Назад у будучыню» (16+).
22.25 «Іншы свет» (18+).
4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

ТБ1000

5.30 Лісты да Джульеты (12+).
7.15 Дарагі Джон (16+).

9.15 Памятай мяне (16+).
11.20, 4.00 Дзевяць жыццяў (6+).
13.00 Таямніца Мунакра (12+).
15.00 Незвычайныя прыгоды Адэль (12+).

17.00, 17.55 Каханне, розум, помста (16+).
18.45 Чалавек-Павук (12+).
21.05 Чалавек-Павук-2 (12+).
23.30 Чалавек-Павук-3: вораг у адлюстраванні (12+).
2.00 Сем'янін (12+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Смяшарыкі (6+).
5.50 Чуч-Мявуч (6+).
6.10 Фіксікі (6+).
6.35 Не лячы мяне (16+).
8.15 Сумленны развод (16+).
10.00 Сумленны развод-2 (16+).
11.40 Кур'ер з Рая (12+).
13.20 Канікулы строгага рэжыму (12+).
15.30, 2.30 Бацькі строгага рэжыму (12+).
17.00, 17.50 След (16+).
18.40 Пракляты чыноўнік (16+).
20.20 Дзень дурня (16+).
22.00 Дзень горада (16+).
23.35 Чыноўнік (18+).
1.05 Адчайныя дольшчыкі (16+).
3.45 Лена і справядлівасць (12+).
5.10 Мыйдадзір (6+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.50, 7.30, 8.15, 23.55, 0.40 Неверагодны доктар Пол (16+).
9.00, 14.15, 23.15 Непакорны вострaў (16+).
9.45, 10.30, 16.30, 17.15, 2.55 Аўта-SOS (16+).
11.15, 12.00, 18.00, 18.45 Дзікі тунец (16+).
12.45, 13.30, 19.30, 20.15, 4.25, 5.10 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.00 Ліхтугі за мяжой (16+).
15.45 Кантрабанда з Марыянай Ван Зэлер (16+).
21.00, 21.45, 22.30, 1.25, 2.10, 3.40 Карэнныя жыхары Аляскі (16+).

ЯСНАе

5.40 Серыял «Ялта 45» (12+).
7.20 Серыял «У чэрвені 41-га» (12+).
9.05 Маст. фільм «Міраж» (16+).
10.30 Серыял «Афіцэры-2» (12+).
12.20 Серыял «Па законах ваеннага часу-2» (16+).
14.10 Маст. фільм «Класік» (16+).
15.55 Серыял «САБР» (16+).
17.35 Маст. фільм «22 хвіліны» (12+).
19.00 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Мінск» — «Слуцк».
21.00 «Час высокіх тэхналогій».
21.25 Маст. фільм «Бабло» (16+).
23.00 Маст. фільм «Стральцоў» (12+).
0.40 Маст. фільм «Раёны» (18+).
2.10 Маст. фільм «Апакаліпсіс» (18+).
4.25 Маст. фільм «Турага» (16+).

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена.
[СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Беларусь 1

6.00, 7.30, 8.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.20, 8.20 Навіны эканомікі.
7.25, 8.25 Зона Х (16+).
9.10 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
9.55, 11.50, 12.15, 13.05 Меладрама «Маскоўскі раман» (16+).
10.50, 1.05 «Скажынемаўчы».
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
15.25 Серыял «След» (16+).
17.05 Сэнс жыцця (12+).
17.30 Маршрут пабудаваны (12+).
18.15 Зона Х. Вынікі тыдня (16+).
18.40, 19.20 Меладрама «Свае. Чужыя. Родныя» (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Клуб рэдактараў (16+).
23.10 Меладрама «Лена і справядлівасць» (16+).
0.50 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
10.00, 16.55 Тэлебарометр.
10.05 «Сляпая» (16+).
10.30 «Знакі лёсу» (16+).
11.05 Дэтэктыў «Акваторыя» (16+).
12.35 Серыял «Той, хто чытае думкі. Менталіст» (16+).
14.20, 20.20 Серыял «Фітнес» (16+).
15.15 Мультсерыял «Прастаквашына» (6+).
15.35 Мультсерыял «Таямніцы Мядовай даліны» (6+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
17.00 Мультсерыял «Маша і Мядзведзь» (0+).
17.15 «Сям'я. Перазагрузка» (16+).
17.45 «Дарагая, я забіў» (16+).
19.00 «Бітва за цела» (16+).
21.10 Спартлато 5 з 36, КЕНА.
21.20 Фільм «Цуд» (12+).
23.15 Драма «Наш бацька» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня».
8.05, 12.30, 13.00, 16.05, 20.30, 23.35 «Навіны культуры».
8.15, 18.45 «Адмірал». Маст. фільм (16+).
10.05, 21.05 «Першая сусветная». Дак. фільм (12+).
10.55, 16.45 «Гардэмарыны, наперад!» Маст. фільм (12+).
12.15 «Архітэктура Беларусі».
13.10, 21.55 «Халоднае лета пяцьдзясят трэцяга...» Маст. фільм (16+).
14.50 «Кадры жыцця».
15.40 «Сіла веры».
16.20 «Камертон».
18.00 «Веды ў кубе».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.45 «Маладыя таленты Беларусі».

Беларусь 5

7.00, 9.55, 16.55 ІІ Гульні краін СНД. Плаванне.
9.00, 14.00, 18.55 «У цэнтры Гульняў».
11.30 ІІ Гульні краін СНД. Баскетбол 3х3. Жанчыны.
15.00, 23.40 ІІ Гульні краін СНД. Баскетбол 3х3. Мужчыны.
19.25 ІІ Гульні краін СНД. Мініфутбол. Узбекістан — Беларусь. У перапынку — «У цэнтры Гульняў».
21.25 Вынікі дня.
21.45 ІІ Гульні краін СНД. Мініфутбол. Расія — Азербайджан.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30 Нашы навіны.
10.00 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Белыя росы» (12+).
11.50, 13.15 Фільм «У чужым краі» (16+).
14.05, 23.15 Фільм «Чаўночніцы» (16+).
16.20 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.30 «Трывожная кнопка» (16+).
18.20 «Народны ДАСТ» (12+).
18.55 «Лялькі спадчынніка Тутці» (16+).
20.05 Вячэрнія навіны.
21.15 «Лаўроў. За гранню» (16+).
21.25 Фільм «Таму, што было — не бываць» (16+).
1.20 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00, 0.55 Дак. праект. Без падману (16+).
10.40, 17.20 Дак. праект (16+).
13.45 Дак. праект. Хронікі маскоўскага побыту (16+).
16.50 «Рашэнне ёсць!»
18.45 «У пошуках ісціны. Тату: у чым сэнс?»
20.10, 23.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Сталічныя падрабязнасці».
20.25 «Міншчына».
20.40 «Выкідала». Серыял (16+).
23.20 «Азаронак. Напрамую».
1.40 «Акадэмія». Серыял (16+).

МІР

5.00 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).
8.10, 11.05, 14.10 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
9.05, 12.00, 13.00, 15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
10.00, 16.00, 18.30 Навіны (бягучы радок).
10.10, 13.05 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
16.15 «Прысуд!?» (16+)
17.10 «Міравое пагадненне» (16+).
18.50 «Слабае звяно» (16+).
19.50 Маст. фільм «Тракцір на Пятніцкай» (16+).
21.40 Маст. фільм «Таямніца «Чорных драздоў» (16+).
23.30 Маст. фільм «Змеялоў» (16+).
1.15 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
2.30 Маст. фільм «Сэрцы чатырох» (16+).
3.50 Маст. фільм «Арынка» (16+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00 Беларусь. Навіны.
10.05, 17.40 Фільм «Сямнаццаць імгненняў вясны».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.40 «Пра самае галоўнае» (12+).
12.50 «Кропкі над і» (16+).
14.40 «60 хвілін».
21.30, 23.15 Фільм «Пачнём усё спачатку» (12+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.15, 8.20, 13.25, 16.45, 19.55, 22.30, 23.30 Сёння. Галоўнае.
6.10 «Здорава здаровым быць!» (6+)
6.55 Сфера інтарэсаў.
7.30 «Маршрут пабудаваны» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35 «НЗ.by».
8.55, 10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Рубяжы радзімы» (16+).
11.15 Серыял «Дэльта» (16+).
13.30 Надзвычайнае здарэнне.
13.55 Серыял «Дзікі» (16+).
16.50 Серыял «Хуткая дапамога» (16+).
20.10, 21.35, 22.35, 23.45 Серыял «Стэпавыя ваўкі» (16+).
21.05 «НЗ.by: час вынікаў».

8 канал

7.00, 21.00 «Надвор'е».
7.05 Мультпарад.
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Дэтэктыў «Паляўнічыя на караваны» (12+)
8.20 Дак. серыял «Загадкі гісторыі».
9.05 Фантастыка «Дзюна» (12+).
11.35 Дэтэктыў «Выклік» (16+).
13.05 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
13.55 Меладрама «Чужое жыццё» (12+).
15.25 «Сабор Парыжскай Багародзіцы» (16+).
17.40, 19.00 «Надвор'е» + «Эрана».
17.45 Серыял «Кветка зла» (16+).
19.05 Меладрама «Стан разводу» (16+).
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.05 «Урокі Лазуркіна».
21.10 «Героі коміксаў на экране» (16+).
23.20 Фэнтэзі «Шабаш» (16+).
2.00 Дэтэктыў «Цень» (16+).

Культура

6.30 «Пешшу...»
7.05 Легенды сусветнага кіно.
7.35, 16.15 Рэпартажы з будучыні.
8.15 «Жыццё і лёс».
8.35, 18.10 «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
8.50 «Канікулы Пятрова і Васечкіна. Звычайныя і неверагодныя». Маст. фільм.
10.00, 12.30, 17.00, 19.30 Навіны культуры.
10.15 «Археалогія. Гісторыя з рыдлёўкай». Дак. серыял.
10.45 «Горад над галавой». Маст. фільм.
12.15 Колер часу.
12.45 Зямля людзей.
13.15, 18.25 Прыступкі цывілізацыі.
14.20 «Святыні Крамля». Дак. серыял.
14.50, 21.55 «Талент». Маст. фільм.
16.00 «Забытае рамяство». Дак. серыял.
17.15, 1.25 Майстар-клас.
19.45 Лісты з правінцыі.
20.15 Дак. фільм.
20.55 «Добрай ночы, малыя!»
21.10, 2.10 «Дубна. Нараджэнне свету».
23.05 «Рэгтайм, або Разарваны час».
23.35 «Спрут-4». Серыял.

Настальгія

6.00 «СевАлогія» (18+).
6.55, 8.45, 9.40, 11.35, 12.45, 14.45, 15.40, 17.50, 20.35, 21.40, 23.30, 3.40, 5.30 Музычная настальгія (12+).
7.15 Маст. фільм «Топер» (16+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
11.00, 17.15, 23.00, 5.00 «Блеф-клуб» (16+).
12.00 «Быў час» (16+).
13.10 Маст. фільм «Абгавораная» (16+).
18.00 «Сляем, сябры!» (12+)
19.00 Маст. фільм «Хаціна на нябёсах» (18+).
0.00 Маст. фільм «Сон у летнюю ноч» (16+).
2.20 «Ад смешнага да вялікага. Аркадзь Арканаў» (16+).

EuroSport 1

4.00, 5.00 Алімпійскія гульні (6+).
6.00, 11.30, 19.30, 1.30 Веласпорт-трэк (6+).
7.30, 12.30 Веласпорт. Мікст (16+).
9.30 Скалалажанне. Мужчыны (0+).
10.30 Скалалажанне. Жанчыны (0+).
13.30 Маўнцінбайк. Жанчыны (6+).
14.15, 23.35 Маўнцінбайк. Мікст.
16.30, 0.30 Веласпорт. Мужчыны.
2.30 Мотагонкі на выносліваць (6+).

Кінакамедыя

1.45, 2.35, 3.20, 4.10 Серыял «Белы каўнерык» (12+).
5.00 «Скінь маму з цягніка» (12+).
6.40 «Бандыткі» (16+).
8.20 «Я, зноў я і Ірэн» (16+).
10.30 «Невынішчальны шпіён» (16+).
12.00 «Кароль вечарынак» (16+).
13.45 «Прабабуля лёгкіх паводзін. Пачатак» (16+).
15.25 «Starперцы» (16+).
17.20 «Жаніх напракат» (16+).
19.30 «Паляўнічы на галовы» (16+).
21.35 «Шпіён» (18+).
23.50 «Рэд» (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.25 «Старац» (16+).
10.25, 17.50 «Уіджы» (16+).
11.20, 4.15 «Перыскоп» (16+).
11.40 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.20, 18.45, 2.45 «Сляпая» (16+).
14.45, 20.10, 3.30 «Варажбітка» (16+).
16.10, 21.40 «Сельскі дэтэктыў» (12+).
23.20 «Грым» (16+).
0.10 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
1.00 «Місія невыканальная» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

ТБ1000

5.35 Незвычайныя прыгоды Адэль (12+).
7.15, 1.45 Эспен у каралеўстве троляў (6+).
9.20, 3.25 Эспен у пошуках Залатога замка (6+).
11.15 Ва ўладзе стыхіі (16+).
13.05 Дзевяць ярдаў (16+).
15.05 Дзевяць ярдаў-2 (16+).
17.00, 17.55 Каханне, розум, помста (16+).
18.45 2012 (16+).
21.40 Грэнландыя (16+).

23.55 Выхаду няма (16+).
5.05 Том, які гаворыць: героі (6+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Смяшарыкі (6+).
5.55 Чуч-Мявуч (6+).
6.25 Фіксікі (6+).
6.45 Лена і справядлівасць (12+).
8.25 Адчайныя дольшчыкі (16+).
10.05 Бацькі строгага рэжыму (12+).
11.35 Бэндэр: пачатак (16+).
13.25 Бэндэр: золата імперыі (16+).
15.05 Бэндэр: апошняя афера (16+).
17.00, 17.45 След (16+).
18.40 Гуляй, Вася! (16+)
20.20 Гуляй, Вася! Спатканне на Балі (16+).
22.20 All inclusive, або Усё ўключана! (16+)

National Geographic

6.00, 5.15 Навуковыя глупствы (16+).
6.45, 7.30, 23.10, 23.55 Неверагодны доктар Пол (16+).
8.15, 13.30, 22.30 Непакорны востраў (16+).
9.00, 9.45, 15.45, 16.30, 2.10 Аўта-SOS (16+).
10.30, 11.15, 17.15, 18.00, 20.15, 21.00, 21.45, 0.40, 1.25, 2.55 Дзікі тунец (16+).
12.00, 12.45, 18.45, 19.30, 3.40, 4.25 Расследаванні авіякатастроф (16+).
14.15 Ліхтугі за мяжой (16+).
15.00 Апошнія волаты (16+).

ЯСНАе

4.40 Серыял «Развітвацца не будзем» (6+).
6.15 Серыял «Лёс дыверсанта» (12+).
8.00 «Раніца ЯСНАя».
9.05 Маст. фільм «Паміж жыццём і смерцю» (12+).
10.35 Серыял «Афіцэры» (12+).
12.20 Серыял «Па законах ваеннага часу» (12+).
14.10 Серыял «Т-34» (12+).
15.45 Серыял «Вікінг-2» (16+).
17.15 Маст. фільм «Знахар» (12+).
19.25 Серыял «Група Зета-2» (16+).
21.00 Дак. цыкл «Сувязісты».
21.25 Маст. фільм «Легенда аб Калаўраце» (12+).
23.25 Дак. фільм «90-я. Бандыцкае кіно» (16+).
0.10 Маст. фільм «Шчыт Айчыны» (16+).
1.35 Маст. фільм «Сляды апосталаў» (12+).
3.30 Серыял «Балада аб бомберы» (16+).

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

чацвер, 10 жніўня ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.25 Зона Х (16+).
9.10 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
9.55, 11.45, 12.15, 13.05 Меладрама «Маскоўскі раман» (16+).
10.50, 1.00 «Скажынемаўчы».
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
15.25, 22.20 Серыял «След» (16+).
17.05 Беларуская часінка.
18.35, 19.20 Меладрама «Свае. Чужыя. Родныя» (12+).
21.00 Панарама.
21.45 Беларуская супержанчына.
21.55 Адзін дзень (12+).
0.05 Сфера інтарэсаў.
0.45 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+).
10.00, 16.55 Тэлебарометр.
10.05, 18.55 «Сляпая» (16+).
10.30, 19.20 «Знакі лёсу» (16+).
11.05, 17.00 Дэтэктыў «Акваторыя» (16+).
12.35, 20.45, 21.20 Серыял «Той, хто чытае думкі. Менталіст» (16+).
14.20, 19.50 Серыял «Фітнес» (16+).
15.15 Мультсерыял «Прастаквашына» (6+).
15.35 Мультсерыял «Таямніцы Мядовай даліны» (6+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
18.35 Мультсерыял «Маша і Мядзведзь» (0+).
21.10 Спартлато 6 з 49, КЕНА.
22.45 «На нажах» (16+).
23.45 «На тыдзень» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.30 «Беларуская кухня».
8.05, 13.00, 16.45, 20.30, 23.20 «Навіны культуры».
8.15, 18.45 «Адмірал». Маст. фільм (16+).
9.55, 21.05 «Першая сусветная». Дак. фільм (12+).
10.50, 16.55 «Гардэмарыны, наперад!» Маст. фільм (12+).
11.55 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
12.20 «Асобы».
13.10, 21.55 «Піраты XX стагоддзя». Маст. фільм (12+).
14.35 «Кадры жыцця».
15.30 «Хіты для мам».
18.05 «Веды ў кубе».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.30 «Маладыя таленты Беларусі».

Беларусь 5

7.00, 21.55 ІІ Гульні краін СНД.
7.55 ІІ Гульні краін СНД. Пляжны футбол.
9.00, 11.25, 16.00, 18.55 «У цэнтры Гульняў».
9.55, 16.55 ІІ Гульні краін СНД. Плаванне.
11.55 ІІ Гульні краін СНД. Цяжкая атлетыка. Мужчыны 102 кг, 109 кг, +109 кг.
19.30 ІІ Гульні краін СНД. Вольная барацьба.
21.35 Вынікі дня.

АНТ

6.00, 7.15, 8.15 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30 Нашы навіны.
7.10, 8.10 «Трывожная кнопка» (16+).
9.10 «Аб'ектыўНа» (16+).
10.10 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Белыя росы» (12+).
11.55, 13.15 Фільм «У чужым краі» (16+).
14.05, 23.10 Фільм «Чаўночніцы» (16+).
16.20 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
19.00 «Удача ў прыдачу!» (12+)
19.05 «Лялькі спадчынніка Тутці» (16+).
20.05 Вячэрнія навіны.
21.15 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
22.00 Фільм «Казанова» (16+).
1.15 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00, 0.55 Дак. праект. Без падману (16+).
10.40 «Ленінград 46». Серыял (16+).
11.30 Дак. праект (16+).
13.50 «Падсудны». Серыял (16+).
16.45 «Рэалізацыя». Серыял (16+).
18.30 Дак. праект. Закулісныя войны (16+).
20.15, 23.05 «СТБ-спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Міншчына».
20.40 «Беларуская супержанчына».
20.50 «Выкідала». Серыял (16+).
23.20 «Азаронак. Напрамую».
1.40 «Акадэмія». Серыял (16+).

МІР

5.00, 4.00 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).
8.10, 11.05, 14.10 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
9.05, 12.00, 15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 18.30, 2.35 Навіны (бягучы радок).
10.10, 13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
16.15 «Прысуд!?» (16+)
17.10 «Міравое пагадненне» (16+).
18.50 «Гульня ў кіно» (16+).
21.35 «Назад у будучыню» (16+).
22.05 «Сусветныя гульні розуму» (16+).
23.00 Маст. фільм «Сумленны, разумны, нежанаты» (16+).
0.20 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
1.10 Маст. фільм «Любімая дзяўчына» (16+).
2.50 «Зроблена ў Еўразіі» (12+).
3.00 [Не]Фантастыка (12+).
3.15 «Каханне без меж» (16+).

РТР—Беларусь

6.00 «Новая раніца».
10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00 Беларусь. Навіны.
10.05, 17.40 Фільм «Сямнаццаць імгненняў вясны».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.40 «Так! Але...»
12.20 «Пра самае галоўнае» (12+).
13.00 «Кропкі над і» (16+).
14.40 «60 хвілін».
18.45 «Малахаў» (16+).
21.30, 23.15 Серыял «Лавец сноў» (12+).
23.40 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.15, 8.20, 13.25, 16.45, 19.55, 22.20, 23.20 Сёння. Галоўнае.
6.10 «Здорава здаровым быць!» (6+)
6.55 Сфера інтарэсаў.
7.30 «Маршрут пабудаваны» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 21.05 «НЗ.by».
8.55, 10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Рубяжы радзімы» (16+).
11.15 Серыял «Дэльта» (16+).
13.30 Надзвычайнае здарэнне.
13.55 Серыял «Дзікі» (16+).
16.50 Серыял «Хуткая дапамога» (16+).
20.10, 21.25, 22.25, 23.35 Серыял «Стэпавыя ваўкі» (16+).

8 канал

7.00, 21.15 «Надвор'е».
7.05 Мультпарад.
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Дэтэктыў «Паляўнічыя на караваны» (12+).
8.20 Дак. серыял «Загадкі гісторыі».
9.05 Мультфільм.
9.30 Прыгоды «Парк Юрскага перыяду-3» (16+).
11.05 Дэтэктыў «Выклік» (16+).
12.35 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
13.25 Меладрама «Чужое жыццё» (12+).
15.00 Дэтэктыў «Містэрыум. Часопіс 64» (16+).
17.00 Дак. серыял.
17.45, 19.05 «Надвор'е» + «Эрана».
17.50 Серыял «Кветка зла» (16+).
19.10 Меладрама «Стан развод» (16+).
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.00 «Асалам алейкум, Беларусь!»
21.10 «Урокі Лазуркіна».
21.20 Драма «Мемуары гейшы» (16+).
23.45 Дэтэктыў «Цень» (16+).

Культура

6.30 «Пешшу...»
7.05 Легенды сусветнага кіно.
7.35, 16.15 Рэпартажы з будучыні.
8.15 «Жыццё і лёс».
8.45 «Канікулы Пятрова і Васечкіна. Звычайныя і неверагодныя». Маст. фільм.
10.00, 12.30, 17.00, 19.30 Навіны культуры.
10.15 «Археалогія. Гісторыя з рыдлёўкай». Дак. серыял.
10.45 «Горад над галавой». Маст. фільм.
12.45 Зямля людзей.
13.15, 18.25 Прыступкі цывілізацыі.
14.20 «Святыні Крамля». Дак. серыял.
14.50, 21.55 «Талент». Маст. фільм.
16.00, 1.10 «Забытае рамяство». Дак. серыял.
17.15, 1.25 Майстар-клас.
17.55 Раман у камені.
19.15 Колер часу.
19.45 Лісты з правінцыі.
20.15 Больш, чым каханне. Ала Парфаньяк і Міхаіл Ульянаў.
20.55 «Добрай ночы, малыя!»
21.10, 2.05 «Дубна. Нараджэнне свету».
23.05 «Рэгтайм, або Разарваны час».
23.35 «Спрут-4». Серыял.

Настальгія

6.00 «Быў час» (16+).
6.45, 8.45, 9.40, 11.50, 14.35, 15.40, 17.30, 21.40, 23.30, 0.55, 2.45, 3.40, 5.35 Музычная настальгія (12+).
7.10 Маст. фільм «Абгаворана» (16+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
11.15, 17.00, 23.00, 5.00 «Блеф-клуб» (16+).
12.00 «Сляем, сябры!» (12+)
13.00 Маст. фільм «Хаціна на нябёсах» (18+).
18.00 Маст. фільм «Блаславёная зямля» (16+).
20.20 «Ад смешнага да вялікага. «Двое з куфэрка» (16+).
0.00 «СевАлогія» (18+).
1.15 Маст. фільм «Топер» (16+).

EuroSport 1

4.00 Скалалажанне. Мужчыны (0+).
5.00 Скалалажанне. Жанчыны (0+).
6.00 Веласпорт-трэк (6+).
7.30, 8.30, 12.30, 13.30, 19.15 Маўнцінбайк. Мікст (6+).
9.35, 0.00, 2.30 Скалалажанне. Мужчыны і жанчыны (0+).
11.00 Тэлечасопіс Discovery Golf (6+).
11.30 Веласпорт-трэк (6+).
14.30, 1.00 Веласпорт. Мужчыны (16+).
15.45, 21.45 Веласпорт. Жанчыны.
19.30 Маўнцінбайк. Мужчыны.
20.30 Маўнцінбайк. Жанчыны.
22.45 BMX. Мужчыны (6+).
23.30 BMX. Жанчыны (6+).

Кінакамедыя

1.50, 3.00, 3.45, 4.40 Серыял «Белы каўнерык» (12+).
5.25 «Ілюзія падману» (16+).
7.30 «Ілюзія падману-2» (12+).
9.50 «Starперцы» (16+).
11.45 «Васабі» (16+).
13.30 «Вясельны перапалох» (16+).
15.25 «Паляўнічы на галовы» (16+).
17.30 «З джунгляў у джунглі» (12+).
19.30 «Дзядуля нялёгкіх павадзін» (6+).
21.15 «Кароль вечарынак» (16+).
23.00 «Норт» (12+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.00 «Старац» (16+).
10.00, 17.45 «Уіджы» (16+).
10.55 «Паглядзім» (12+).
11.25 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.05, 18.40, 3.00 «Сляпая» (16+).
14.35, 20.05, 3.45 «Варажбітка» (16+).
16.05, 21.35 «Сельскі дэтэктыў» (12+).
23.15 «Грым» (16+).
0.05 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
1.00 «Пяты элемент» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

ТБ1000

5.40 2012 (16+).
8.20 Грэнландыя (16+).
10.40 Выхаду няма (16+).
12.35 Праз снег (16+).
14.50 Вайна светаў Z (12+).
17.00, 17.55 Каханне, розум, помста (16+).
18.45 Памятай мяне (16+).
20.50 Лісты да Джульеты (12+).
22.50 Дарагі Джон (16+).
0.50 Гісторыя сям'і Блум (12+).

2.15 Таямніца Мунакра (12+).
3.50 Незвычайныя прыгоды Адэль (12+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Смяшарыкі (6+).
6.15 Чуч-Мявуч (6+).
7.00 Фіксікі (6+).
7.55 Гуляй, Вася! (16+)
9.40 Гуляй, Вася! Спатканне на Балі (16+).
11.40 All inclusive, або Усё ўключана! (16+)

13.25 Прыстойныя людзі (16+).
15.05 З 8 Сакавіка, мужчыны! (12+)
17.00, 17.45 След (16+).
18.40 Не лячы мяне (16+).
20.25 Сумленны развод (16+).
22.10 Сумленны развод-2 (16+).
23.45 Канікулы строгага рэжыму (12+).
1.50 Прыстойныя людзі (16+).
3.15 Кур'ер з Рая (12+).

National Geographic

6.00, 5.15 Навуковыя глупствы (16+).
6.45, 7.30, 23.10, 23.55 Неверагодны доктар Пол (16+).
8.15, 13.30, 22.30 Непакорны востраў.
9.00, 9.45, 15.45, 16.30, 2.10 Аўта-SOS (16+).
10.30, 11.15, 15.00, 17.20, 18.00 Дзікі тунец (16+).
12.00, 12.45, 18.45, 19.30, 3.40, 4.30 Расследаванні авіякатастроф (16+).
14.15 Ліхтугі за мяжой (16+).
20.15, 21.00, 0.40, 1.25, 2.55 Кантрабанда з Марыянай Ван Зэлер (16+).
21.45 НЛА: даследаванне невядомага (16+).

ЯСНАе

5.20 Серыял «Развітвацца не будзем» (6+).
6.55 Серыял «Лёс дыверсанта» (12+).
8.40 «Ясна аб футболе».
9.10 Маст. фільм «Зоя» (16+).
10.55 Серыял «Афіцэры» (12+).
12.40 Серыял «Па законах ваеннага часу» (12+).
14.25 Маст. фільм «Лета. 1941» (16+).
16.20 Серыял «Вікінг-2» (16+).
17.55 Маст. фільм «Круты» (16+).
19.25 Серыял «Група Зета-2» (16+).
21.00 «У адкрытым доступе».
21.30 Маст. фільм «Жмуркі» (16+).
23.20 Дак. фільм «90-я. Бомба для афганцаў» (16+).
0.00 Маст. фільм «Бацька» (12+).
1.30 Маст. фільм «Ідзі і глядзі» (16+).
3.50 Серыял «Балада аб бомберы» (16+).

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена.
[СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.

ДОКТАР ДРЭННАГА НЕ ПРАПІША

Дзед Антось у свае недзе пад восемдзясят да дактароў амаль не хадзіў, бо, па-першае, у ягонай вёсцы іх не было (да найбліжэйшай, дзе былі, — кіламетраў восем, да райбальніцы — каля трыццаці), а па-другое, бабка Ядзя блізка жыла, і ў яе кладоўцы чаго не вісела: усе бэлькі ды сцены ў цвічках былі, у торбачках з зеллем. І на кожным — надпіс: «Ад галавы», «Ад жывата», «Ад прастуды», «Ад нерва»...

Шкада, што ад смерці нічога не было, а таму сышла бабуля ў лепшы свет. Не стала ў вёсцы і яе «аптэкі». А вось галава Антосю балела ўсё часцей.

Неяк раз (пасля ўчарашняга), дык нават не на жарт: як абцугамі хто бедную сціснуў! Цэлы дзень чалавек прамучыўся, ноч не спаў, а раніцой (ці ж не цуд?) да іх у вёску перасоўны медпункт прыехаў, усіх выхароў каля сябе сабраў!

Антось таксама прытэпаў, прычакаў чаргі, расказаў дакторцы пра сваю галаву.

Тая падрабязна распытала яго, дзе баліць, як, — паслухала сэрца, памерала ціск, дала таблетак. Адну хворы тут жа выпіў, і яму палягчэла...

Вечарам ён другую збіраўся прыняць, дастаў з пакуначка, але ж на дне яго ўбачыў паперку. Разгарнуў — ледзь не посцілка выйшла, бо ў дзесяць столак зложана і так ужо дробненька спісана — з абодвух бакоў!

Дзед начапіў на нос акуляры, сеў чытаць дый дзівіцца: аказалася, што ў адной маленькай пігулачцы (чаго б век не падумаў!) ёсць і міліграмы крухмалу, і цэлюлоза, і нейкі ападрай, і дыяксід тытану з аксідам жалеза, і яшчэ мо з дзясятак назваў, якія нават вымавіць нельга!

...Шмат часу адняло чытанне складу лекаў, яшчэ больш — «пабочак» ды мер перасцярогі, бо якіх толькі наступстваў не абяцалася ў той паперы! Можа, як высвятлялася, адкрыцца кровацячэнне, з'явіцца аддышка і гемарой, язва, пячоначная недастатковасць, крапіўніца, сіндромы нейкіх джонсанаў...

Лекі не раілі дзецям да 16, хворым пасля аперацый, пры ўжыванні алкаголю, павышанай стамляльнасці, кіроўцам у час язды...

— Раней, у Ядзінай «аптэцы», хапала кароткага «Ад галавы», а цяпер во цэлую дысертацыю выдалі! — паскардзіўся Антось сваёй суседцы. — Але ж добра, што я прачытаў, а то глынуў бы таблетку пасля чаркі-другой і... язва. Ці гемарой.

— А ты б меней выпіваў ды чакаў іх, гэтых хвароб, — параіла жанчына, — верыў дактарам. Не дарэмна ж яны гадамі вучыліся?!

— І сапраўды, — падумаў Антось... На здаровую галаву.

Дык можа, і хворым больш не будзе?

Віктар Сабалеўскі,

г. Узда.

ЛАВІСЯ, РЫБКА, ВЯЛІКАЯ І МАЛЕНЬКАЯ!

Не вам казаць: больш за ўсё сваімі трафеямі хваляцца рыбакі ды паляўнічыя. Прычым перабольшваюць — разоў, можа, у дзесяць! Ведаюць, што брэшуць, і ўсё роўна... Парода людзей такая. У нас дзядок адзін быў. Расказваў, што зайца злавіў — ростам з цяля. Ватнік на яго накінуў, паваліў... А той заяц — шмыг у рукаво — і выскачыў. «Столькі мяса ўцякло!» — шкадаваў стары і сам сабе верыў. Па сённяшнім часе — нават доказ прадставіць мог, бо смартфоны ж цяпер ці не ў кожнага?

У Мішы ён таксама ёсць — было б што здымаць!

А вось з гэтым — праблема: іншыя рыбакі ляшчоў з вады падымаюць, а яму ўсё плоткі трапляюцца... Усім казаў, што жонка іх больш любіць... (Яны і праўда смачнейшыя.)

...Налавіў неяк раз, дадому сабраўся, а перад гэтым вырашыў па беразе прайсціся — паглядзець, што ў іншых рыбакоў.

Малюнак Анатоля ГАРМАЗЫ.

Нічога, бачыць, такога — у большасці. Толькі ў аднаго — лешч. Ды вялізны — кілаграмы з чатыры!

Падзівіўся Міхась, пазайздросціў, прасіў дазволу «сфоткаць», каб жонцы паказаць. А назаўтра — ці не чорт падбіў? — яшчэ і мужыкам...

Не ведаю, як дзе, а ў нас апошнім часам завядзёнкі змяніліся. Жанкі ў краму забягуць, што трэба, хуценька возьмуць, слоўцам перакінуцца і па дамах: паводзіны іншых дзевак ды чужыя справы іх чамусьці мала цікавяць. Мужыкі ж, як толькі сыдуцца, саб'юцца ў «касяк», бы тыя ляшчы — дык пайшло-паехала: хто, дзе, што, з кім?..

Міша ў дрэнную хвіліну да іх прыбіўся, дастаў смартфон, сказаў:

— Гля якога «звера» я ўчора падняў!

І давай распавядаць, як вадзіў яго, як цягнуў...

А з-за спіны раптам:

— Не, брат... Не так было!

Мужыкі — тут жа ў рогат, бо ўсё зразумелі. А Мішу — хоць скрозь зямлю праваліся! Хоць на Дняпро не хадзі, бо ўсе ж з падколкамі: па каго, маўляў, сёння ідзеш? Можа, зараз судака падымеш?

Якраз гэтага Міша і хацеў, каб заткнуліся, ён нават марыў, можна сказаць, бо ведаў, што рыба гэтая вельмі каштоўная! Не дарэмна ж другое стагоддзе пяюць, як не лёд трашчыць, не камар пішчыць — «...Это кум до кумы судака тащит». Не шчупака, не ляшча, нават не язя!

Карацей, «накаркалі» мужыкі: апынуўся Міша ў патрэбным месцы ў патрэбны час! І выцягнуў-такі з вады судака!.. Ды якога — кілаграмаў на пяць!

Каб пабачыць гэтакі цуд, усе рыбакі сышліся! «Фоткалі» рыбіну, падбівалі Мішу парыбачыць яшчэ, але ён не стаў выпрабоўваць лёс: павалок судака не да нейкай кумы, а дадому, да сваёй любай жонкі.

Рыбакі ж на беразе засталіся. У надзеі на судака яны доўга яшчэ «махалі» вудамі, але ж лавілі хіба розную драбязу, бо рыбацкае шчасце яно такое: то плоткі-плоткі і раптам лешч... А то ляшчы, ляшчы і раптам плоткі. Рыба, яна — у рацэ, а не ў руцэ...

Так што Мішу з «прысвоеным» ляшчом больш ніхто не даймаў — на ўсялякі выпадак. Раптам зноў судак яму натрапіцца — кілаграмаў на дзесяць...

І хто тады яны са сваімі ляшчамі? Ды можна сказаць, няўдачнікі.

С. Вароніна,

Быхаўскі раён.

ВЯСКОВЫЯ КАНІКУЛЫ

Радасць мела баба Каця:
Ім вязуць унука!
З той нагоды —
бляск у хаце,
Пірагоў тры штукі!
Пышных пончыкаў з варэннем
На ўсю шафку
міса:
Трэба ж,
каб худзенькі Сеня
Трохі адкарміўся.
— Можа, тыдзеньчык пабудзе? —
Просяць дочка з зяцем.
— Замінаць ён вам не будзе:
З тэлефонам сядзе...
— Што вы?! Гэтак не кажыце:
Хай жыве ўсё лета!
Тэлефон з сабой вязіце,
Чула, шкодзіць гэта.
З дзецьмі ж нам не прывыкаць —
Знойдзецца занятак:
Будзе смачна есці-спаць,
Пасвіць куранятак...
...Дзень прайшоў, другі і трэці —
SOS нясецца з вёскі:
— Забірайце Сеньку, дзеці!
Гэта ж кара боска!
Чуеш, мілая дачушка, —
Мы не можам болей:
Рукі ў дзеда ўжо трасуцца,
Я — на карваломе.
Ну мяркуй сама: за лазняй
Жук агонь разводзіць!
Як запалкі ні схаваем —
Недзе іх знаходзіць!
«Супер-нянднзя» напісаў
Ён на парасятах,
У карыта ім наклаў
Чыпсаў з мармеладам...
Агуркамі цераз плот
Днём «страляўся» з Мішкам.
Патаптаў агарод,
Паламаў вішні...
Пеўня лётаць навучыў
З хлеўчука да ганка,
Котцы нервы палячыў
Цёплай валяр'янкай.
Лёткі ў вуллях заляпіў
Ізастужкай, шкодзень.
Гэта ён эксперымент
Вырашыў праводзіць...
А ўчора ў студню жаб
З сябрам накідалі,
Адвячоркам нашых баб
Ля кладоў спужалі.
Па рацэ хацелі плыць
У старой балеі.
Шчасце, што змаглі спыніць,
Што яшчэ паспелі...
Забірай, дачка, яго!
Заўтра?
Лепей зранку:
Мы з дзядулем,
далібог,
Не гадзімся ў нянькі!
...Ад'язджае шалапут,
Абдымае дзеда:
— Не сумуйце, — кажа, — тут,
Хутка зноў прыеду.

Алена Несцяронак,

г. Докшыцы.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Ад яе ж — так званы гарык: (чатыры радкі Губермана):

Народ любой
воистину духовен
(а значит — и Создателем ценим)
не духом синагог или часовен,
А смехом
над отчаяньем своим.

Пішыце!

Неасабісты суб'ектыў

СВАЕ-ЧУЖЫЯ

Навука жыць па-суседску ў спадчыну не перадаецца?

Толькі выйшла з непрацяглага адпачынку, думаю, якую б тэму ў калонцы закрануць, а тут прыходзіць у пісьме на электронную пошту падказка. Піша Наталля з суседняга з нашым Стаўбцоўскага раёна. Не скардзіцца — проста дзеліцца тым, што хвалюе. Тэма — вяскова-дачная і, як для мяне, дык надзвычай для нашага часу тыповая і актуальная. Таму, калі дазволіце, спачатку перакажу той допіс блізка да арыгінала.

Наталля — новаспечаная дачніца. Чаму новаспечаная? Як і многія з нас, яна да нядаўняга часу была проста дарослай дачкой старых ужо бацькоў. І ездзіла ледзь не кожныя выхадныя і кожны летні водпуск у родную вёску не на дачу — дадому. Але бацькі адно за адным памерлі, і Наталля разам з дзвюма сёстрамі стала спадчынніцай дыхтоўнай бацькоўскай хаты. Якая нерапварылася ў дачу, бо ўсе жанчыны працуюць, так што жыць там пастаянна няма магчымасці. «І так у нас усё ладна, — піша жанчына. — Мы не дзелім куткі, як іншыя, усе прыязджаем са сваімі сем'ямі, працуем, гатуем, сталуемся разам, агарод агульны на ўсіх садзім. Мы ж адна сям'я, што дзяліць? Нас так бацькі заўсёды вучылі...» Пагадзіцеся, сапраўды можна пазайздросціць. Бо колькі прыкладаў, калі маленькую хатку спадчыннікі, якія ў дзяцінстве ў гэтай хаце з адной міскі елі, дзеляць удоўж і ўпоперак, а пасля яшчэ хтосьці з іх сваю «адваяваную» частку возьмеды прадасць чужым людзям. Карацей, Наталлі тут, можна сказаць, вельмі нават пашанцавала. Але ёй не пашанцавала з іншым (і калі шчыра, я не ведаю, што тут горш). Ёй не пашанцавала з суседзямі.

«Што характэрна, і адну, і другую суседку ведаю столькі ж, колькі сябе. З адной у адзін клас вясковай школы хадзілі, нават некалькі гадоў за адной партай сядзелі. Я нават сведкай у яе на вяселлі была — яна раней замуж выйшла. З другой усе канікулы разам як спрэжаныя былі, вельмі ў дзяцінстве сябравалі, яна да сваёй бабулі з горада прыязджала. Пасля, праўда, шляхі нашы разышліся — раз'ехаліся па розных гарадах, ва ўсіх сем'і, дзеці, пасля ўнукі. Бачыліся зрэдку, прыязджаючы да сваіх старых, віталіся, размаўлялі прыязна пра справы, пра сям'ю. Адкуль што раптам узялося, што стала прычынай іхняй агрэсіўнай нахабнасці — ніяк не магу даўмецца...»

А здарылася так, што Наталля і яе суседкі-равесніцы прыкладна ў адзін час сталі з прыезджых гарадскіх гасцей паўнапраўнымі гаспадынямі вясковых сядзіб — былыя гаспадары, лічы, за нейкі год-два «перасяліліся» на вясковыя могілкі. Спадчыннікі, выканаўшы ўсе жалобныя традыцыі, хутка ўжыліся ў новую ролю ўласнікаў фазэндаў. Вось тут і пачалося. Спачатку адна суседка пачала наракаць Наталлі і яе сёстрам на яблыню, якая нібыта кідае цень на яе двор і засланяе градкі. «А тую яблыню бацька мой садзіў, яшчэ як мы малыя былі. І старэйшай гаспадыні, маме гэтай, новай, яна ніколі не перашкаджала, і на градах у яе ўсё радзіла. Сапраўды, там адна галіна на іх двор нахілілася, дык я ж дазволіла яе спілаваць — у яе трое сыноў прыязджаюць ледзь не кожныя выхадныя. Замест таго яна лінула праз плот нейкай атруты. Прапала і яблыня, і маліна на ўчастку, і кусты парэчак... Пасохла ўсё, лісты пакручаныя. Пайшла да яе, кажу: што ж ты робіш? А яна ў вочы смяецца і кажа: яно ў цябе само пасохла, такая ты, відаць, гаспадыня добрая. Хацела заяву на яе ў міліцыю напісаць, але параіліся з сёстрамі ды вырашылі гэтак не рабіць. Кусты бы яблыню новыя можна купіць і пасадзіць, а адносіны суседскія канчаткова псаваць не хочацца...»

А суседка з іншага боку, тая, з якой сядзелі за адной партай, дзеліць з Натальляй і яе сёстрамі палоску зямлі. «Наш хлеў і ізняя павець спрадвеку, мо яшчэ з даваеннага часу, страха да страхі стаялі. Так дзяды нашы пабудавалі, і ўсё ўсіх задавальняла. Плот паміж гэтымі пабудовамі калі і быў, дык разбурыўся даўно, яшчэ не пры нас. Цяпер яна дастала аднекуль схему, даказвае мне, што наш хлеў пабудаваны насуперак усім правілам занадта блізка ад яе ўчастка, патрабуе, каб мы яго зносілі, інакш пойдзе ў суд. А ў мяне зяць, архітэктар, паглядзеў ды заявіў: мы, маўляў, таксама ў суд пойдзем, бо ваша павець таксама не па правілах пабудаваная, зносьце тады і вы сваю... Пакуль на гэтым і скончылася, але мы цяпер адна з адной не вітаемся нават, не тое што пагаварыць...»

«Ведаеце, я ўспамінаю, як была маладая, глядзела, як нашы матулі кожны вечар збіраюцца на чыёй-небудзь лаўцы, чакаючы кароў з поля, і так хораша размаўляюць, жартуюць. Ці як дзеляцца адна з адной насеннем, саджанцамі, соллю, цукрам... чым заўгодна. Я тады думала: у нас з дзяўчатамі, як пасталеем, будзе яшчэ лепш. Бо яны ж, матулі нашы, чужыя зусім адна адной спачатку былі, замуж з розных месцаў сюды павыходзілі. А мы ж з самага дзяцінства амаль як родныя... А яно во як атрымалася. Ці мы такія, ці жыццё такое?..»

А яно сапраўды так атрымліваецца. Кожны з такіх новаспечаных дачнікаў-вяскоўцаў можа прыгадаць падобную гісторыю, калі не з уласнага досведу, дык з таго, што адбываецца на вачах. Людзі, якія гадаваліся разам, хадзілі ў адну школу, гулялі ў «вайнушку» і «выбівалы», атрымаўшы ў спадчыну бацькоўскую хату, пачынаюць вайну сапраўдную. Патраўленыя грады, бензін у калодзежы, заявы адно на аднаго ў суд і міліцыю — усё ідзе ў ход. Добра, што яшчэ хаты не падпальваюць, хоць часам ужо і да гэтага недалёка... Што не могуць падзяліць? Што хочуць даказаць? А можа, такім чынам спрабуюць супакоіць уласнае сумленне, загладзіць віну. Кінулі ж калісьці бацькоўскую хату, пайшлі шукаць шчасце ў горадзе, нератварылі ў рэшце рэшт яе ў дачу. А цяпер даводзяць самі сабе і іншым: я адказны, я пільны, я о-го-го які сапраўдны гаспадар!..

І што ты каму скажаш? Тыя, хто маглі сказаць, навучыць, падказаць, як яно — жыць у вёсцы па-суседску, ціха ляжаць зусім недалёка адно ад аднаго на пагорку пад елкамі ці бярозамі. І лепш верыць, што яны адтуль нічога не чуюць і не бачаць...

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

Центр Промышленной Оценки • ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ • ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191021390
Продавец	ОАО «Белшина», г. Бобруйск, ш. Минское, 4. УНП 700016217
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by**)
Предмет электронных торгов	

Встроенное офисное помещение 491,1 кв. м

(административно-торговое помещение, инв. номер 710/D-54707).

Адрес: **Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Максима Горького, д. 38а**

Начальная цена лота с НДС 20 % – 1 197 239,48 бел. руб.

Обременение: площади помещения сданы в аренду. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона

Задаток **10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,5 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 06.09.2023 с 11.00 до 12.00.

Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 05.09.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «МТЗ» (Продавец)

Аукцион состоится **04.09.2023** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1 в составе:

1. Здание карантинника на 300 голов, 407,5 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149390, инв. № 100403.
2. Механизированное зернохранилище емкостью 1000 т, 714,9 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149386, инв. № 100365.
3. Убойный пункт свинотоварной фермы на 1000 голов, инв. № 100341, 143,3 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149316, инв. № 100341.
4. Дезбарьер, площадь застройки 77,0 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149320, инв. № 104596.
5. Канализация бытовая, 285,0 м: № по ЕГРНИ 600/С-149330, инв. № 104590; инв. № 104589.
6. Здание свинарника-откормочника на 1000 голов, 1604,9 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149327, инв. № 100404.
7. Весовая, 87,0 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149391, инв. № 100342.
8. Хранилище для картофеля, овощей и фруктов, 663,8 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149387, инв. № 100364; инв. № 100561; инв. № 104594.
9. Водопровод пожарно-питьевой, 1573,8 м: № по ЕГРНИ 600/С-149389, инв. № 104591.
10. Здание свинарника для откорма на 1000 голов, 2591,1 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149331, инв. № 100339; инв. № 101594; инв. № 101743; инв. № 101740; инв. № 104593; инв. № 211241.
11. Трансформаторная подстанция свинотоварной фермы, 45,6 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149338, инв. № 100340; инв. № 185127; инв. № 185021; инв. № 185022.
